Райскія пеўні ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВОЛЬГА І АЛЯКСАНДР АНЦУТКІ ☞ 11

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 10 (2547) Год L | Беласток, 6 сакавіка 2005 г. | Цана 2,00 зл.

Не чакаю падтрымкі беларусаў у Польшчы. Чакаю, што ўсвядомяць яны, якія працэсы ў нас адбываюцца і будуць сябе паводзіць свядома. Частка беларускага асяроддзя ў Польшчы паддаецца фальшу...

Шушкевіч у Варшаве

— Часта здараецца, што беларуская меншасць у Польшчы паддаецца беларускай рэжымнай агітацыі, якой крыніцай з'яўляюцца спецслужбы. Не чакаю падтрымкі беларусаў у Польшчы. Чакаю, што ўсвядомяць яны, якія працэсы ў нас адбываюцца і будуць сябе паводзіць свядома. Частка таго асяроддзя ў Польшчы таксама хворая, як большасць грамадзян Беларусі. Тая частка асяроддзя паддаецца фальшу. У „Нівы" ёсць тут свая роля. Можа яна паказваць прыклады тае маны.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Так сказаў „Ніве" ў Варшаве праф. Станіслаў Шушкевіч, старшыня дэмакратычнага Вярхоўнага Савета Беларусі пачатку дзевяностых гадоў. Прыбыў ён у сталіцу па запрашэнні Варшаўскага універсітэта з дакладам „Пасля «аранжавай рэвалюцыі» — Беларусь?". Звяртаючыся да студэнтаў, навуковых кадраў і пастаронніх назіральнікаў, пачаў ад параўнанняў па тэрыторыі, насельніцтве ды гісторыі Беларусі і Украіны. Прыйшоў да вываду:

— Беларусы заўжды былі, з традыцыйнай расійскай жорсткасцю, груба адвучваны беларушчыне.

Спасылаючыся непасрэдна на тэму даклада, прыгадаў:

— Праграмы Віктара Юшчанкі і дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі — аднолькавыя, апрацаваныя паводле аднолькавай тэхналогіі, абапіраючыся на разнародную групу.

На ягоную думку, перад найбліжэйшымі прэзідэнцкімі выбарамі застанецца невядомае, ці нават добрая праграма знойдзе падтрымку беларускага грамадства. Таму, перад апазіцыяй, якая яднаецца — палітычным актывам кааліцыі дэмакратычных партый „Пяцёркай+" (у апошні час ужо „Дзесяткай+") — стаіць пераконванне людзей да таго — пры недахопе незалежных СМІ і немагчымасці доступу да дзейнічаючых масмедыяў, рэжымных — па прынцыпе хаджэння „ад дзвярэй да дзвярэй".

— Змена палітычнай сістэмы ў Беларусі адбудзецца цывілізаваным спосабам, але без вашай дапамогі прыйдзецца нам яшчэ доўга пачакаць, — дадаў.

У Размове з „Нівай", праф. Шушкевіч ацаняў сітуацыю Беларусі:

— У Беларусі пануе ўсёдазвол. Лукашэнка робіць што хоча, ён непрадказальны. На практыцы няма падзелу ўлады, няма незалежных судоў, свабодных медыяў, апазіцыя рэпрэсаваная. Найважнейшы, аднак, факт, гэта тое, што Расія падтрымлівае дзеянні Лукашэнкі. Захад у сваю чаргу звяртае ўвагу на тых, якія не ёсць фактычна апазіцыяй, не той, задзіночанай, значыць, кааліцыяй шасці няўрадавых партый: „Пяцёркай+", а ў прынцыпе, пасля далучэння яшчэ чатырох груповак, „10+".

І адзначыў:

— Размаўляць з Лукашэнкам — няма сэнсу. Ён маніць і не выконвае абяцанняў. Захад увесь час хоча выхаваць Лукашэнку, але гэта не мае ніякага сэнсу.

Як павінна весці сябе Польшча?

— З тактычна-палітычнага пункту гледжання Польшча не павінна падтрымліваць антыдэмакратычныя сілы ў Беларусі, але сітуацыя Польшчы нялёгкая. Гэта суседняя краіна, шмат сем'яў жыве па абодвух баках мяжы; іх сітуацыю вызначае няраз трансгранічнае супрацоўніцтва. Катэгарычная пастаноўка спраў у палітычным маштабе ў двухбаковых кантактах будзе супраць гэтых людзей. Аднак, не мусіць быць кантактаў на вышэйшым узроўні.

На думку С. Шушкевіча, калі беларуская меншасць у Польшчы хацела б нейкім чынам дапамагчы дэмакратыі ў Беларусі, павінна скантактавацца з „Пяцёркай+", у склад якое ўваходзіць м.інш. Беларускі народны фронт ці ягоная Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада. Аднёсся ён таксама да планаванага З'езду беларусаў свету „Бацькаўшчына"; адначасова некаторыя з яе дзеячаў ужо атрымалі забарону ўезду на тэрыторыю беларускай дзяржавы:

— На маю думку, зрабіць такі з'езд, поўнасцю неабмежаваны, свабодны, з удзелам усіх прадстаўнікоў беларусаў у свеце, немагчыма. Можа ператварыцца ён у фарс. Лепш было б, калі б адбыўся ён у іншай краіне. Аднак, не хацеў бы я выказвацца наконт гэтага адназначна.

Спасылаючыся на сітуацыю беларусаў у Польшчы, прызнаўся:

— Заўсёды стаяла праблема нашай фінансавай падтрымкі. У значнай ступені гэтыя праблемы магчымыя для вырашэння беларускай меншасцю з мясцовымі ўладамі. Не заўсёды да месца ўмяшанне суседняй краіны. Прызнаюся, што не раз, чытаючы аб некаторых справах, хоць бы ў „Ніве", хочацца мне аж плакаць ад турботы.

Станіслаў Шушкевіч (фізік па прафесіі), у 1991 г. разам з тагачаснымі кіраўнікамі Расіі і Украіны падпісаў дагавор аб роспуску СССР. У 1994 г., ужо пасля адмены яго з пасады старшыні, Вярхоўны Савет назначыў яму пажыццёвую пенсію. **У 1997 г. Аляксандр Лукашэнка выдаў дэкрэт, у адпаведнасці з якім Станіслаў Шушкевіч не мае права на змену вартасці пенсіі па курсе. Не памаглі судовыя апеляцыі. Пры лавіннай інфляцыі і ў пераліку на долары пенсія першага кіраўніка незалежнай Беларусі роўная 1,8 долара ЗША.**

— Пражыць на такія грошы — немагчыма. Чагосьці ў жыцці, аднак, я навучыўся. Пакуль дазваляе здароўе, працую за мяжой. Не маю магчымасці працы ў Беларусі.

Мацей Халадоўскі

Юбілеі і гадавіны ☞ 2

Віталь Луба

Сакрат Яновіч паставіў такі вось сумны дыягназ: „У палітыцы няма сентыментаў і на яе вырашэнні ўплывае вызначальны ёй рахунак. Калі на гэты баланс добры скутак ад утрымлівання «Нівы», то яна дастане неабходныя сродкі. Але калі каторагасьці года акажацца, што можа яе ўжо не быць, то і не будзе. Так было як быццам ад пачатку. Цяпер жа, аднак, гэта проста кідаецца ў вочы". Ад двух гадоў...

Каб не пісалі ☞ 2

Віктар Сазонаў

Не ўсім падабаецца што піша той ці іншы паэт або пісьменнік. Тым больш калі іх шмат, і іхныя погляды на надзённыя праблемы нацыі супадаюць. Але адны кажуць, што няма чаго наракаць на люстэрка, калі морда крывая, ды спрабуюць зрабіць з гэтай „морды" штосьці падобнае на твар. Іншыя пачынаюць біць гэтае люстэрка. Ды яно, нават разбітае, усё адно ў кожным сваім адшчэпленым кавалачку паказвае ўсё тыя ж хібы...

Выдатныя расказчыкі ☞ 4

Аляксей Мароз

— Вучням, якія гавораць па-свойму, лягчэй расказваць. Калі яны сыходзілі з падрыхтаванага раней расказу, маглі імправізаваць і вяртацца да запланаванага фрагмента аповеду. Цяжэй выступаць вучням, якія гавораць на літаратурнай беларускай мове і навучыліся расказваць на памяць. Калі яны нешта забываюць, цяжка ім гэта схаваць перад слухачамі, — кажа Барбара Трафімюк з Грабаўца...

Гадышэва ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

Гаварылі, што калісь у Гадышэве бацюшка з жыдам змовіліся зрабіць цуда і ікону на ліпу чаплялі. Калі вярнуліся першыя бежанцы, то кругом царквы валяліся іконы і харугвы. Званы з царквы закапаны, мабыць, на могілках; каля 1980 года былі ахвотныя шукаць іх з дэтэктарам металаў, але ім не дазволілі. Калі ў царкве абсталявалі касцёл, праваслаўныя ўдзельнічалі ў набажэнствах, але пасіўна — да споведзі не прыступалі...

Рассечаная Апака ☞ 9

Уладзімір Сідарук

У час устанаўлення савецкай граніцы ў 1948 годзе мяжу павялі праз вёску. Адзін бок Апакі заставаўся ў СССР, другі — у Польшчы. Людзі ў перапалоху ўцякалі на польскі бок. Прыехалі вайскоўцы і загадалі заставацца. Праз нейкі час мяжу перанеслі за вёску, пад лес, там дзе зараз яна знаходзіцца. Што паўплывала на перамену рашэння ды хто за тым стаяў — цяжка сказаць...

9 770546 196000

Юбілеі і гадавіны

Сорак дзевяць гадоў мінае з часу выхаду першага нумара «Нівы». Мне самому прыйшлося быць сведкам і ўдзельнікам дваццаці гадавін і прымеркаваных да іх мерапрыемстваў — грандыёзных, камерных і зусім незаўважных.

Упершыню ў святкаванні ніўскага юбілею ўдзельнічаў я ў 1986 г. у якасці сакратара ГП БГКТ. Тады ў зале Дома прафсаюзаў у Беластоку была сарганізавана папулярна-навуковая сесія, прысвечаная 30-годдзю БГКТ і «Нівы», а на другі дзень адбыўся ўрачысты пленум БГКТ. „Вялікія дасягненні мае наш орган «Ніва». Матэрыялы, што друкуюцца на старонках «Нівы», спрыяюць фарміраванню дружных суадносін паміж палякамі і беларусамі, папулярызуюць і распаўсюджваюць традыцыі супольных змаганняў з ворагамі, уплываюць на рост нацыянальнай свядомасці, прапагандуюць палітыку партыі і дзейнасць БГКТ", — пісалася тады ў справаздачы з юбілейных урачыстасцей. З нагоды юбілею дзеячы таварыства і журналісты атрымалі медалі і адзнакі, а святкаванне закончылася канцэртам лаўрэатаў агляду „Беларуская песня-86".

Дзесяць гадоў пазней юбілейнае мерапрыемства мела больш камерны характар, таму што пазбавіўшыся статусу органа святкавалі мы толькі ў рэдакцыйным коле.

Да саракавой гадавіны выйшаў спецыяльны нумар з архіўнымі і сучаснымі здымкамі стваральнікаў «Нівы» — журналістаў, карэспандэнтаў і працаўнікоў рэдакцыі. З выпадку свята на Універсітэце ў Беластоку адбылася канферэнцыя з нагоды 40-годдзя «Нівы». Канферэнцыю папярэдзілі афіцыйныя віншаванні і прывітанні. Упершыню ў рэдакцыйнай урачыстасці прысутнічалі дыпламаты Рэспублікі Беларусь. Тадышні міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Сянько ў віншавальным лісце пажадаў нам „надалей заставацца сапраўдным носьбітам беларускага слова, нацыянальнай культуры і мастацтва ў Польшчы", а генеральны консул у Беластоку Міхась Слямнёў сам асабіста выказаў спадзяванне, „што яскравае, а часам і калючае слова «Нівы» будзе і далей прабуджаць нацыянальную свядомасць людзей, фарміраваць у іх павагу да мовы, традыцый і абрадаў сваіх продкаў, спрыяць развіццю беларускай культуры".

У зачытаных на канферэнцыі дакладах даваліся ацэнкі нашаму тыднёвіку. Напрыклад, прафесар Андрэй Садоўскі адзначыў істотную ролю «Нівы» ў складаным працэсе станаўлення беларускай меншасці менавіта як нацыянальнай, а не толькі праваслаўнай. Паводле Віктара Шведа паяўленне «Нівы» было натуральным штуршком у ягонай літаратурнай дзейнасці. „Каб не «Ніва», я відавочна ў далейшым нічога б не пісаў" — адзначыў паэт.

Дзевяць гадоў таму не было медалёў для заслужаных журналістаў і карэспандэнтаў, што заўважыў Мікола Ваўранюк, які свой артыкул аб юбілейнай канферэнцыі закончыў такой вось прыпіскай: „Пакрыўджаным, якія ў сваіх вачах заслужылі на ўзнагароды, вестка з апошняй хвіліны: на 50-годдзе «Нівы» будзеце ўзнагароджаны медалямі імя Бядулі". Гэта ж праз год!

Зусім камерны характар мела святкаванне 35-годдзя, калі на сяброўскай сустрэчы спаткаліся журналісты, супрацоўнікі рэдакцыі і пенсіянеры. Падобны характар мела сустрэча з нагоды 45-годдзя. Тады з рэдакцыйным калектывам сустрэліся члены Праграмнай рады тыднёвіка «Ніва».

Астатнія гадавіны не адзначаліся намі ў выглядзе адмыслова арганізаваных мерапрыемстваў, але пра дзень з'яўлення першага нумара тыднёвіка заўсёды хтосьці помніў. Памяталі таксама нашы верныя чытачы, якія віншавалі нас, тэлефанавалі, заходзілі ў рэдакцыю. Напрыклад, у дзевяностыя гады 4 сакавіка наведвала рэдакцыю спадарыня Анна Стэльмашук з Засцянак з кветкамі і віншаваннямі.

У дакладзе на 40-годдзе «Нівы» Сакрат Яновіч паставіў такі вось сумны дыягназ: „У палітыцы няма сентыментаў і на яе вырашэнні ўплывае вызначальны ёй рахунак. Калі на гэты баланс добры скутак ад утрымлівання «Нівы», то яна дастане неабходныя сродкі. Але калі каторагасьці года акажацца, што можа яе ўжо не быць, то і не будзе. Так было як быццам ад пачатку. Цяпер жа, аднак, гэта проста кідаецца ў вочы". Ад двух гадоў мы на сабе адчуваем рэальнасць гэтага дыягназу і пагрозу, якая навісла над рэдакцыяй. А сёлетняя гадавіна будзе яшчэ дадаткова азмрочана фактам выклікання двух членаў Праграмнай рады ў суд для дачы дадатковых тлумачэнняў перад маючым адбыцца працэсам.

Віталь Луба

Каб па-беларуску болей не пісалі

Пісьменнікаў і паэтаў называюць сумленнем нацыі, вартавымі яе духоўнай спадчыны. Дзяржаўныя бюджэты, нават у самыя цяжкія для эканомікі краіны часы, выдаткоўваюць сродкі на развіццё культуры, знаходзяць мажлівасць падтрымаць тых, хто першы адчувае духоўныя праблемы грамадства і заклікае да іх выпраўлення. І нават тыя колы грамадства, якія мала цікавяцца літаратурай, ніколі гэтаму не пярэчаць. Усе ведаюць — так трэба. Трэба каб друкаваліся кніжкі, каб ладзіліся сустрэчы з паэтамі, пісьменнікамі, мастакамі... Каб культурны ровень нацыі быў устойлівым, а пажадана і рос. Кожны чалавек адчувае гэта сэрцам — нельга па-іншаму, бо ўслед за бескультурнасцю надыходзіць бездухоўнасць, абыякавасць, агрэсіўнасць...

Не ўсім падабаецца што піша той ці іншы паэт або пісьменнік. Тым больш калі іх шмат, і іхныя погляды на надзённыя праблемы нацыі супадаюць. Але адны кажуць, што няма чаго наракаць на люстэрка, калі морда крывая, ды спрабуюць зрабіць з гэтай „морды" штосьці падобнае на твар. Іншыя пачынаюць біць гэтае люстэрка. Ды яно, нават разбітае, усё адно ў кожным сваім адшчэпленым кавалачку паказвае ўсё тыя ж хібы.

Гісторыя чалавецтва ведае багата прыкладаў, калі той ці іншай уладзе не падабаліся погляды і творчасць культурнай эліты. Гэтыя рэжымы часамі заігрывалі з ёй, спрабавалі схіліць на свой бок, падмануць, задобрыць, урэшце „купіць" яе прадстаўнікоў. Штосьці ўдавалася, хтосьці паддаваўся, ламаўся, „падманваўся"... Але народ, нейкім схаваным у самых глыбінях чалавечай душы пачуццём, заўсёды адрозніваў дзе чуе голас свайго сумлення, а дзе проста „прафесійна" зрыфмаванае, або пад звон хутка зляпленых з прычыны прапагандысцкай неабходнасці „ўзнагарод", загорнутае ў прыгожую вокладку пустаслоў'е, брыдота, падман...

Пахаванне славутага беларускага пісьменніка Васіля Быкава ў 2003 годзе чарговы раз гэта пацвердзіла. Ніхто нікога масава не клікаў, ды людзі самі прыйшлі аддаць даніну павагі свайму вялікаму земляку. Ніхто нікога не агітаваў, але нацыя з'ядналася і схіліла галовы...

Здавалася б, кожны тады зразумеў, што культурнай эліце нельга „заткнуць рот". Яна будзе дзеіць і ў сябе на Радзіме, і, калі так складзецца, то і ў эміграцыі, і нават пасля смерці, бессмяротныя творы песняроў будуць прымушаць людзей задумвацца пра важнае, праўдзівае, вечнае...

Але... Чацвёртага лютага ў Саюз беларускіх пісменнікаў ад кіраўніцтва справамі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і адміністрацыі таго ж прэзідэнта прыйшлі лісты з патрабаваннем пакінуць пакой № 201 у Доме літаратара. Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў адмовілася падпарадкавацца.

Яшчэ ў 1997 годзе, пабудаваны на сродкі Саюза пісьменнікаў Дом літаратара, указам прэзідэнта быў пераведзены на баланс кіраўніцтва справамі прэзідэнта. У 2001 годзе Саюз пісьменнікаў быў зняты з дзяржаўнага фінансавання. У 2002 годзе ў яго забралі яшчэ ладны кавалак плошчы. Зараз Саюзу беларускіх пісьменнікаў прапаноўваюць трохі больш за 50 квадратных метраў. Каля 500 творцаў можа і знайшлі б сабе месца дзе працаваць, але што рабіць з унікальнай бібліятэкай (40 тысяч тамоў)? І каму трэба, каб 70-гадовая гісторыя існавання Саюза пісьменнікаў прыпынілася? Каму і чым не дагадзілі беларускія пісьменнікі? Можа тым, што хавалі Васіля Быкава пад тым сцягам, які той любіў, які натхняў яго на творчасць і не даваў пакою няўрымслівай душы. А мо не дагадзілі тым, што закранаюць сваёй творчасцю тэмы, на якія хтось наклаў манаполію. Можа не хваляць аджыўшы савецкі лад, які таксама любіў душыць творцаў і навязваць народу сваіх „арцістаў". Але людзі слухалі Уладзіміра Высоцкага і верылі, што заўсёды будуць сапраўдныя паэты, якія „ходзяць пятамі па вастрыі нажа, і рэжуць да крыві свае босыя душы".

А можа ўсё значна прасцей і адначасна складаней, як не парадаксальна гэта гучыць. Можа проста таму не шануюць нашых літаратараў, што многія з іх умеюць, хочуць і пішуць па-беларуску.

Здавалася б, гэта поўны абсурд пазбавіць сваю культурную эліту мажлівасці мець сваё, зручнае для працы і творчых сустрэчаў памяшканне. Мала якая акупацыйная ўлада адважваецца на такія крокі. Толькі тая, што хоча канчаткова знішчыць акупаваную нацыю. Але каб свая!!!

Нацыянальная культура паўстае тады, калі нараджаецца нацыя. І пакуль культура развіваецца, развіваецца і нацыя, ідзе наперад. І пакуль нацыя ёсць, культуру знішчыць немажліва. Заўсёды народзіцца нехта, хто пакліча з „путаў да свабоды, з цемры да святла".

Віктар Сазонаў (Гродна)

Вачыма еўрапейца

Немагчымае магчымае

У перадапошнім нумары „Нівы" пісаў я ў гэтай рубрыцы аб нялёгкай сітуацыі адзінаццаці студэнтаў распушчанага Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Мінску. Прынялі іх пад крылы Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі ў Беластоку. Дзякуючы стараанням Сената гэтай вучэльні і асабістаму ангажаванню рэктара, заадно падляшскай еўрадэпутаткі праф. Барбары Кудрыцкай, звольнілі іх з немалых аплат за навучанне. ВШПА дакладваецца таксама да інтэрната. Аднак, каб пражыць (каб неяк пракарміцца), беларускія студэнты мусяць самі даваць сабе рады. Ні беластоцкія гарадскія ўлады, ні міністэрства адукацыі не бачаць магчымасці падтрымаць іх, скажам, такім чынам, як стыпендыямі, на што разлічвала праф. Кудрыцкая. ВШПА сама пакуль што не ў змозе выкласці такія грошы на стыпендыі.

Нядаўна меў я нагоду размаўляць з Пятром Вэнгленскім, рэктарам Варшаўскага універсітэта, які на хвалі дакляраваў аб дапамозе польскіх вучэльняў студэнтам Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта таксама яе дакляраваў, дарэчы, не толькі маладым людзям з гэтай беларускай вучэльні.

— Студэнтаў з Беларусі без аплат мы былі б гатовы прыняць няшмат, — сказаў ён. — Маем затое ва універсітэце два фонды — установы, якія змаглі б аплаціць кошты іх пражывання і навучання ў Польшчы. Першы гэта Студыі Усходняй Еўропы спадара Яна Маліцкага, другі — Гуманітарныя міжгаліновыя студыі, якія вядзе Ежы Аксер. Адзін і другі карыстаюцца вонкавымі фондамі, не універсітэцкімі: спадар Маліцкі грашамі назначанымі польскім парламентам, спадар Аксер — галоўным чынам амерыканскімі грашамі, ад фонду Сораса. Значыць, маглі б яны прыняць нейкі лік студэнтаў з Беларусі, з гарантаваннем ім побыту. Мяркуючы аптымістычна, не больш за сто.

Рэктар прызнаўся:

— Мы, як вучэльня, можам устанаўляць стыпендыі толькі на невялікім узроўні. Дапамагалі мы гэтак студэнтам з былой Югаславіі, хоць бы з Косава, больш за дзесяць стыпендый атрымалі маладыя людзі з Афганістана, паасобныя з Самалі. У некаторых выпадках, калі студэнты залічаць першы курс, можам дапамагчы перайсці ім на стыпендыі Міністэрства адукацыі. Маем таксама свае кантакты з заходнімі вучэльнямі, хоць бы з нямецкімі ці чэшскімі. Значыць, можам пасрэднічаць у кантактах з іншымі краінамі.

Ян Маліцкі пералічыў, што на двухгадовых усходніх студыумах вучыцца каля 20 беларусаў. Пачынаюцца таксама заняткі м.інш. на аднагадовай паліталагічнай студыі, якая ахопіць пятнаццаць беларускіх студэнтаў. Студыя каардынуе таксама магчымасць навучання і, што важнейшае, утрымання, значыць, афармляе гадавыя ўрадавыя стыпендыі для чарговых дваццаці студэнтаў і для яшчэ адной такой групы на грошы аднаго з фондаў:

— Адзінае, чаго не гарантуем, гэта кошты прыезду і ад'езду. У выпадку паліталагічнай студыі, аднак, гэтыя кошты аплачваем таксама. Ёсць шанц здабыць грошы на гэтую мэту з дадатковых урадавых датацый, можа не на поўную вышэйшую адукацыю, але на дадатковае павышэнне кваліфікацыі, на ўдасканальванне кадраў. У сёлетнім дзяржбюджэце значна павялічылася датацыя на дапамогу замежжу. Гэта значыць — на сапраўдную дапамогу Беларусі і Украіне.

Відаць, ёсць магчымасці, каб беларусы, таксама з мінскага Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, пачынаючы ў Польшчы навучанне, не мусілі баяцца за ўтрыманне. Толькі зноўку — як і ў іншых выпадках: тое што немагчымае — магчымае, адно толькі, што на захад ад Віслы.

Мацей Халадоўскі

Любімым заняткам Антошы, апроч эратычных заваёваў, была і ёсць гадоўля курэй...

Час райскага пеўня

— Было такое! — чырванее Антоша Круп. Гісторыя ёсць дурненькая і гэта добра разумее сам герой і таму пра здарэнне распавядае выключна ў п'яным відзе.

Злосныя языкі бачаць тут яшчэ выяўленне варажбы з удзелам курэй і пеўня.

Бо „цырк" разыграўся ў каляду кітайскага **Года Пеўня**, значыць, у магічны дзень як наша Гагатуха.

— *Пожывэм-побачым!*, — уздыхае Антон Круп, — *Будэ відно...*

* * *

Яшчэ нядаўна Антоша Круп карыстаўся заслужанай славай першага Казановы і Дон Жуана ў Н. і нават у парафіі. Прытым яго любімым заняткам, апроч эратычных заваёваў, была і ёсць гадоўля курэй. Ён гадзінамі мог выседжваць ля акна і скрыта любавацца сваімі курачкамі і пеўнем. Антошка ў пэўным сэнсе паўтараў рытуал продкаў. Яго прабабка Параска ніколі адкрыта і шчыра не дазволіла зірнуць на сямейнае хараство, а ў хвіліны захаплення шаптала закляцце тыпу: „Соль табе Парасачка ў вочы"!

Антоша не раскідаўся соллю, хоць заўзята чытаў магічныя часопісы тыпу „Gwiazdy mówią" ды вульгарна-салёную парнуху. Апошняй не ўдзяляў увагі і замест „упрыгожваць" ёю сцены, як старыя кавалеры ў Н., кідаў у сметніцу, дзе і валялася разам з лучынай і паленамі падрыхтаванымі для падпалкі.

Вось і ў вілею **Года Пеўніка** Антоша Круп сядзеў ля акна з кубкам кавы „Sido" і хваляваўся за лёс планеты. Карацей, ён чытаў у апошнім нумары „Wróżki" пра апакаліпсіс і жахлівае цунамі ў Тайландзе.

— Ку-ка-рэ-ку! — запеў, неяк дзіка, Прыблуда.

Антоша зірнуў на сваіх курэй, заўсміхаўся і далей патануў у катастрафічную літаратуру.

Кукарэканне паўтарылася.

Пасля гадзіны кудахтання, кукарэкання і запявання, якое Антошу напамінала чамусьці музыку рэп, гаспадар прыкмеціў сцэну. Насупраць сябе стаялі Юха з Прыблудам і змагаліся быццам рыцары на турніры. Аднак, што здзівіла Антошку, паводзілі сябе як пацыфісты — не біліся і не дзяўбліся, а толькі кукарэкалі — хто галасней! Усяму, вядома, прыглядаліся куры, якія стаялі ў бяспечнай адлегласці і кукахталі, быццам публіка на трыбуне.

— Нейкая аранжавая рэвалюцыя ў мяне на панадворку? — падумаў Круп і ад уражання туды-сюды захадзіў па сваёй прасторнай кухні. Змаганне на кукарэканне, здалося яму, трывала без канца. Сам Круп, не ведаць калі, зрабіўся балельшчыкам матча і так як яго куры перажываў — як гэта ўсё скончыцца?

Наздзіў — перамог Прыблуда! Райскі пеўнік, які з'явіўся невядома адкуль і навошта ў адзін летні вечар. Чорны конь турніру, значыць, чырвоны певень Юха, з самавітым як вяргінія грэбенем, прыняў да ведама свой пройгрыш. Ён адышоў за кацубнік, а пасля цалкам прапаў...

Антоша Круп нават пашкадаваў ветэрана, хоць яшчэ больш сябе, што не паспеў зарубаць Юху і згатаваць смачны булён.

* * *

Два тыдні пазней ноччу ў Н. успых перапалох. Толькі цяпер выявілася, што ў старой хаце Касцюкоў зноў аб'явіўся д'ябал, значыць, нячысцік жыве там з 13 студзеня 1972 года. Тады менавіта мясцовая кавалерка, за намовай чароўнай паненкі Ані Касцюк, наладзіла ў Гагатуху спірытычны сеанс. Моладзі пашанцавала выклікаць здань, з якой сям'я змагаецца ўжо трыццаць тры гады. Д'ябал, як вядома, не спіць, ды час ад часу закрадаецца ў новую хату і вычварае фокусы. То зжарэ бульбу з каструлі, то разалье ваду з вядра на дываны, то раскіне пер'е па чыстым пакоі і мэблі. Што не рабілі Касцюкі, дзе не падаваліся за дапамогай, няма спосабу. Не дапамагаюць чарадзейныя замовы, ні бацечка са свянцонай вадой, ні партрэт Сталіна, які пакойная бабуля Прузына выразала з падручніка беларускай мовы 1952 года і павесіла на покуці, накрыўшы рытуальна „выцінанку" іконкай святога Юр'я. Яшчэ летам 1972 г. Касцюкі запісаліся ў партыю, атрымалі беззваротны крэдыт ды мігам пабудавалі белую мураванку. Праўда, злыдзень упадабаў сабе больш традыцыйную архітэктуру, і, як кажуць, жыве сабе як пан у старой хатцы. Ніхто дакладна не ведае як маюцца яго справы — на ўсякі выпадак людзі з бояззю жагнаюцца, калі пераходзяць побач сядзібы Касцюкоў, вядомай ужо ў народзе, як „Чортаў Хвост".

Вось, у першы дзень **Года Пеўніка**, Пётар Касцюк, як заўсёды, пайшоў у старую хатку, каб зачарпнуць асыпку для быка. Нягледзячы на гады сужыцця з нячысцікам, Пётар баяўся абіваць парогі старой хаткі. Цяпер таксама дзеля адвагі ён мармытаў пад носам песню: „Ты мяне над крыніцаю..."

Пётар насыпаў з каробкі асыпкі і ўжо пераступаў парог, як раптам... грук! Касцюк азірнуўся і... здранцвеў. З коміна вылазіў чырвоны певень, з грэбенем як вяргінія.

Як заклінаюцца ў Н., Касцюк прастаяў на адным месцы да вечара.

* * *

Нашы крытыкі ўсё брэшуць, быццам у „Нівы" няма кантакту з народам. Калі ласка — зараз, пра мой ахвярны кантакт з глыбінкай, канкрэтна з жыхарамі вёскі Н.

25 лютага г.г. у дзве гадзіны ночы разбудзіў мяне назойлівы званок тэлефона.

— У нас чорт з коміна вылупіўся! — паінфармаваў п'яненькім голасам мой сімпатычны герой Ёзік Дрозд („Замольванне каўтуна").



Мал. МІРАСЛАВА ЗДРАЙКОЎСКАГА

Пасля яшчэ балбатаў у трубку п'яны Антоша Круп і даказваў, што *Толік мае заёба*, таму мне неабходна прыехаць у Н. і пачуць усю гісторыю з... першай рукі, значыць, з яго вуснаў.

— *А мы ўжэ тут прышыкуемся!* — дадаў неяк сардэчна.

Ды і ў мяне была нагода для святкавання, якраз у культавым літчасопісе *Annus Albaruthenicus* надрукавалі па-англійску міні-раман „Горкі шакалад" родам з Н.

Праўда, гісторыю з д'яблам я палічыла жартам, і пэўнай зайздрасцю з-за медыяльнай славы, якая прыліпла да Толіка Д. пасля публікацыі ў „Ніве".

З Антонам Крупам у першы дзень немагчыма было згаварыцца. Мой будучы герой усё спяваў, або апавядаў салёныя гісторыі пра прадажны секс, напрыклад, як ён сам выкарыстае першыя еўрасаюзныя датацыі:

— Ja sobie jużem dawno obiecał, żem piersze pieniędzy z tej Uni to wydam na dziewczynki. Na takie ekstra, nie na jakie tam czarapachi...

Хоць аповеды Антошы К. мяне смяшылі, Толік Дрозд знерваваўся і склікаў праз *камурку* сваю хеўру. Пасля пачалася перастрэлка на словы і шарпаніна, як у каўбойскіх фільмах. Балбатуна-эратамана ізалявалі.

— Хаме, нэ будэш *obrażać pani redaktor!*

Найперш выкрунулі яму рукі, а пасля завалаклі на панадворак Шуркі С. і, не пытаючы ў яе дазволу, шпурнулі спадара Крупа ў аўчарню. Ля дзвярэй яшчэ прывязалі сабаку Максімкавых, клічка — „Потвур".

Не дапамаглі мае аргументы, што на двары мароз і чалавек адмарозіць сабе, напрыклад, нос.

* * *

Вернемся аднак да нашай гісторыі з райскім пеўнікам...

Хто ведае, які быў бы далейшы лёс Пеці Касцюка, каб не адна трагедыя. Вось у першы дзень **Года Пеўня**, дакладна 9 лютага ў 17 гадзін 52 хвіліны, загарэлася клуня ў згаданай ужо ўдавы Шуркі. Тут трэба адзначыць, што Пётар Касцюк — першы ў акрузе пажарнік-добраахвотнік. Вось і цяпер з пазіцыі „слупа" выбіў яго доўгачаканы роў пажарнай сірэны. Хоць у Н. ад урочышча Касцюкоў тры кіламетры, Пётар з'явіўся раней чым Арлянская пажарная каманда. Праўда, злыя языкі даказваюць, што арлянскія пажарнікі прыехалі апошнімі не з-за ляноты і бязладдзя, а толькі з-за *палітыкі* войта, які пазамыкаў на тры ключы пажарныя машыны. Хлопцы і дзяўчаты (там працуе таксама жаночая каманда) пакуль рушылі ў бой, мусілі ўзарваць сцяну дэпо.

Ніхто не ведаў пра здарэнне ў старой хатцы Касцюкоў, (сутыкненне фактаў наступіць 25 лютага, у дзве гадзіны ночы, перад згаданым ужо тэлефонам-запрашэннем!), але тады наш Пётар, як сам пажар, кідаўся на дваццаць кіламетраў ў вочы. І, вядома, на языкі. Шырокая публіка, што ўміг з'ехалася на машынах з усёй гміны, шаптала, што ў Касцюка ўступіў сам чорт. Ён першы кінуўся ў агонь і як кот скакаў па сценах, па вышках, па ентках. Выгружваў з занятай агнём клуні старыя цапы, хамуты, капанькі...

І хоць старой стадолкі ўдавы не пашанцавала адратаваць, Пётар Касцюк быў узнагароджаны. Пасля пажару ён зайшоў прысыпаць соллю свежа апараныя рукі ў гасцінную хатку пацярпеўшай гаспадыні. Як даказваюць зайздросныя языкі, чуллівая ўдава па сённяшні дзень займаецца лекаваннем нашага героя.

Паводле іншых — збылося ТОЕ, што паказалі на панадворку пеўні. Вось яшчэ да пажару, значыць, да апошняга дня кітайскага **Года Малпы**, пані Шурка, найахвотней *лекавала* Антошу Крупа.

* * *

Вось яшчэ інфармацыі з апошняй хвіліны: калі ўчора я зноў наведала Н., выў вецер і скрыпеў пад нагамі снег. Антоша Круп ішоў усёй шырынёй вуліцы ў расхрыстанай фуфайцы, без шапкі і шаліка ды ваўкавыйна заводзіў: „Белым снегооо....".

Між песнямі ён балбатаў пра канец свету і пра першую інвестыцыю за еўрасаюзныя залатоўкі:

— *Куплю пісталет і заб'ю к...!*

Цяпер у Н. не спяць па ночах і гадаюць — каго менавіта заб'е Антоша К.?! Адны кажуць, што найперш расправіцца з подлым сапернікам, другія — што з няверной удавой, трэція — што застрэліць іх абое злоўленых у момант *лекавання?*

Толік Дрозд, хоць летуценнік, мяркуе, што ўсё скончыцца мірна, як у Кіеве. Праўда, у Крупа ўжо няма шанцаў на ранейшую славу Дон Жуана, і таму ён дрыгае як недацяпаны певень.

Ёсць на гэта ў Толіка жалезныя аргументы.

Вось, неўзабаве Пётар Касцюк, атрымае на рукі найбольшую кампенсацыю да гектара з Еўрасаюза. Не то што ў яго найбольшая колькасць зямлі — не. Дадатковыя грошы Брусель налічыць за цяжкія ўмовы гаспадарання ва ўрочышчы „Чортаў Хвост"!

Ева Сцепанюк

Ці будзе каму супрацоўнічаць?

Апошнім часам сродкі масавай інфармацыі, пераважна тэлебачанне, пачало заклікаць людзей да супрацоўніцтва з паліцыяй у абароне парадку і правоў грамадзян ад кантрабандыстаў, зладзеяў і ўсялякіх хуліганаў. На маю думку, гэта добры заклік, бо кожны грамадзянін нашай дзяржавы хоча спакойна жыць. Цікава толькі як пасля выбараў, калі ўжо адсунуць СЛД ад улады, што тады скажуць такія палітыкі як Р. Гертых ад Лігі польскіх сем'яў ці Л. Дорн ад ПіСу аб людзях, што супрацоўнічалі з паліцыяй? Ці можа яны посткамуністычныя сышчыкі, ці проста здраднікі народа. А можа тыя людзі знойдуцца на г.зв. спіску Вільдштэйна і трэба будзе іх судзіць? Многія ўжо перакананы ў гэтым, і не пойдуць з нікім супрацоўнічаць, а пераважна бараніць палітыкаў.

* * *

Прачытаў я вершы Юркі Буйнюка ў „Ніве" студэнцкай ад 13 лютага г.г. і прыйшло мне ў галаву адно, што Юрка Буйнюк, родам з вёскі Маліннікі што на Бельшчыне, вырастае на сапраўднага беларускага паэта. Пазнаёміўся я з Юркам у Бельскім доме культуры ў 1996 г. на падвядзенні вынікаў I Конкурсу беларускай паэзіі і прозы. Юрка тады, як наймалодшы ўдзельнік, і я — як найстарэйшы, сталі лаўрэатамі.

Не падумаў я тады, што Юрка Буйнюк можа стаць сапраўдным паэтам, але, відаць, пацягнула яго родная мова і, закончыўшы Бельскі беларускі ліцэй, паступіў на беларусістыку ў Беластоцкі універсітэт і ўжо з'яўляецца студэнтам V курса.

Жадаю Юрку поспехаў у заканчэнні навукі ды ў асабістым жыцці, а пераважна здароўя няхай дасць яму Бог.

Мікалай Лук'янюк

Браканьерства

Артыкул Міры Лукшы „Тры ганавічнікі" („Ніва" н-р 6) паказвае, як марнуюцца маладыя людзі, што паверылі ў гарэлку, як іхнія жыццёвыя мары разваліліся як картачны домік. Да гарэлкі дайшло яшчэ браканьерства, а мо і зладзейства. Вядома, што сёння і многія законныя паляўнічыя займаюцца браканьерствам.

Калісь у нас, у міжваенны час, адзін лоўчы, дзядзька Емяльян (пра яго было калісь у „Ніве") зловіў на гарачым учынку ў нашай хваіне браканьера з Карыцыск і моцна яго аддубасіў. Я гаварыў ягонаму сыну Мікалаю, што ягоны бацька быў адважны, калі адбубніў такога, але пакойны ўжо дзядзька Мікалай адказаў мне:

— Бацька быў неразумны, бо іншы лоўчы таксама хацеў распраўціцца з іншым браканьерам, калі зловіў яго на гарачым учынку, але той сказаў: „Не падыходзь, бо буду страляць!" Аднак ахоўнік лесу накінуўся на яго, а той пацягнуў за курок сваёй стрэльбы і цяжка параніў лоўчага.

І будзь мудры распраўціцца сёння з браканьерам, калі ён можа быць легальным паляўнічым.

(мп)

Займальныя расказчыкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пераможцы (злева): Барбара Трафімюк, Андрэй Грыгарук і Анна Грыгарук

У VI Конкурсе беларускай гавэнды, які 25 лютага арганізаваў Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, удзельнічалі шматлікія вучні падставовых школ і гімназісты. Адносна мала ліцэістаў рашылася выступіць перад сваімі сябрамі. Настаўнікі тлумачаць, што найлягчэй заахвоціць да конкурсу гавэнды наймалодшых вучняў. Ліцэісты аддаюць перавагу дэкламацыі.

Мерапрыемства распачалося з выступлення наймалодшых удзельнікаў конкурсу. Вучні падставовых школ найчасцей свае расказы абапіралі на казкі або літаратурныя творы. Аднак здараліся расказы з мінулага і аповеды аб цяперашніх здарэннях.

— Мне падабаецца беларуская мова і я расказваю на ёй. Умею я таксама гаварыць па-свойму, — заяўляе Магда Дарашук з Падставовай школы н-р 6 у Гайнаўцы, якая на заняткі беларускай мовы ходзіць з першага класа. З ёю пастаянна вучыцца Юстына Іванюк, якая да расказу рыхтавалася з мамай. Пасля заканчэння падставовай школы дзяўчаты будуць паступаць у гайнаўскую белгімназію.

Больш аўтарскіх расказаў прадставілі гімназісты. Некаторыя з іх з дапамогай настаўнікаў, бацькоў і знаёмых падрыхтавалі расказы на мясцовых гаворках. Гімназісты расказвалі пра хвалюючыя іх справы. Паколькі большасць расказчыкаў паходзіць з вёсак, закраналі яны ў сваіх аповедах тэмы вясковага жыцця. Крытыкавалі яны адмоўныя паводзіны жыхароў вёсак, якія іх смешаць і раздражняюць. Здаралася, што ўдзельнікі конкурсу спасылаліся на народныя павер'і, з якімі сустракаюцца ў сваіх мясцовасцях.

— Вучням, якія гавораць па-свойму, лягчэй расказваць. Калі яны сыходзілі з падрыхтаванага раней расказу, маглі імправізаваць і вяртацца да запланаванага фрагмента аповеду. Цяжэй выступаць вучням, якія гавораць на літаратурнай беларускай мове і навучыліся расказваць на памяць. Калі яны нешта забываюць, цяжка ім гэта схаваць перад слухачамі, — кажа Барбара Трафімюк з Грабаўца, якая штогод паспяхова выступае ў конкурсе беларускай гавэнды. Выступаючы ад імя белліцэя, яна традыцыйна падрыхтавала аповед аб вясковым жыцці на дубіцкай гаворцы. Яе расказ датычыў жыхаркі вёскі, якая гадавала кароў і паехала ў Варшаву за сродкамі на дальны апарат.

— Я таксама хацела б жыць на вёсцы і заняцца даеннем кароў. Вясковая праца мяне не палохае. Люблю жыццё сярод прыроды, а горад мяне абмяжоўвае, — дабаўляе Барбара Трафімюк і мяняе тэму. — Конкурс беларускай гавэнды патрэбны, бо заахвочвае да вывучэння беларускай мовы. Хаця ведаем сваю гаворку, то трэба вучыцца літаратурнай беларускай мовы, бо яна замацоўвае нацыянальную беларускую свядомасць.

— Да конкурсу беларускай гавэнды вучні прыступаюць ахвотна. Гэта больш свабодная, чым дэкламацыя, формула прэзентацыі ўмеласцей дзяцей і моладзі і таму вучням лягчэй да яе падрыхтавацца. Гімназісты, якія прыязджалі на конкурс гавэнды ў мінулых гадах, паспелі ўжо пазнаёміцца з моладдзю іншых школ, — гаворыць настаўніца з Дубіч-Царкоўных Галіна Трашчотка. — Самыя лепшыя рэзультаты, калі вучні самастойна або з дапамогай старэйшых асоб рыхтуюць свой аповед.

— Я рыхтавала расказ самастойна, а ў падрыхтоўцы да конкурсу дапамагала мне мама, — заяўляе Анна Грыгарук з гайнаўскай белгімназіі, якая расказала пра студэнцкае жыццё. — Я лічу, што пра поспех у конкурсе не вырашае падбор тэмы для аповеду. Трэба проста зацікавіць расказчыка. Таксама думаюць іншыя белгімназісткі Анна Раманюк і Юстына Аўласюк. Пераможца мінулагодняга конкурсу гавэнды Ева Мароз расказала пра хворую настаўніцу і яе вучняў. Рашылася яна падабраць больш складаную для расказу тэму, каб развіваць свае ўмеласці.

Некаторыя ўдзельнікі падрыхтавалі доўгія расказы і конкурс зацягнуўся. Многія вучні і іх апекуны не змаглі застацца да канца мерапрыемства. Трэба ім было вяртацца ў свае школы. Пасля гмінным транспартам разам з іншымі вучнямі дабіраліся ў свае вёскі, рассеяныя па Гайнаўскім павеце. Калі камісія вырашала каму прызначыць галоўныя ўзнагароды, з канцэртам перад удзельнікамі мерапрыемства выступіў ліцэйскі калектыў „Знічка". Прыгожы дзявочы спеў спадабаўся маладым удзельнікам конкурсу, якія з беларускай песняй сутыкаюцца ў сваіх школах.

Старшыня конкурснай камісіі, дырэктар беларускага музея Ян Карпюк перад уручэннем узнагарод звярнуў увагу на высокі ўзровень прэзентацыі расказаў. Сярод 50 удзельнікаў мерапрыемства ажно 15 асоб было ўзнагароджаных. У гэтым годзе найбольш пераможцаў было з Чыжоўскай гміны і Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы.

Сярод вучняў падставовых школ камісія найвышэй ацаніла расказ **Мажэны Дзмітрук** (I месца), **Паўліны Башун** (II месца) з Падставовай школы ў Чыжах і **Наталлі Андрэюк** з Кленік (II месца). Трэція месцы занялі **Юстына Іванюк** з ПШ н-р 6 у Гайнаўцы і **Юстына Тамашук** з ПШ н-р 3 у Гайнаўцы. З групы гімназістаў чарговы раз запар першае месца заняла **Марта Матысюк** са школы ў Нараўцы. Другія месцы занялі **Анна Грыгарук** з Гайнаўскай белгімназіі і Магдаліна Дудзіч са школы ў Нарве. Трэція месцы камісія прыдзяліла ажно чатыром удзельнікам — **Паўліне Сяроцкай** з Гімназіі ў Дубічах-Царкоўных, **Паўліне Чурак** з Гайнаўскай белгімназіі, **Войцеху Лешчуку** з Гімназіі ў Нараўцы і **Каролю Грыгаруку** з Гімназіі ў Чыжах. Хаця мала ліцэістаў удзельнічала ў конкурсе, то ўзровень іх расказаў быў высокі. Першыя месцы занялі гайнаўскія белліцэісты **Барбара Трафімюк** і **Андрэй Грыгарук**. На другім месцы апынулася **Іаанна Стоцкая** з Варшавы, якая літаратурнай беларускай мовы вучылася ў школе ў Нарве.

— У гэтым годзе вельмі высокі ўзровень расказаў. Больш, чым у мінулых гадах было тэкстаў, якія вучні рыхтавалі самастойна, з дапамогай настаўнікаў або бацькоў. Асабліва добра выступілі гімназісты. У час аповедаў здаралася, што вучні гаварылі з няправільным націскам. Такой пагрэшнасці не было ў вучняў, якія расказвалі на гаворцы, — кажа член конкурснай камісіі, беларусіст Ірэна Ігнатовіч. — Штогод мала асоб з белліцэя прымае ўдзел у конкурсе і трэба было б заахвоціць іх у будучыні да больш актыўнага ўдзелу ў гавэндзе.

Да ўдзелу ў конкурсе прыцягваюць вучняў таксама каштоўныя ўзнагароды. Настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі, які ад першага выпуску ладзіць гавэнду, шукаў спонсараў таксама па-за сценамі сваёй школы. Грошы на альбомы і кніжкі перадалі павятовыя і гарадскія ўлады, школьны бацькоўскі камітэт і Марк Сабалеўскі з Варшавы. Усім удзельнікам конкурсу былі падрыхтаваны дыпломы. Віншавальныя лісты з рук дырэктара Яўгена Сачко атрымалі настаўнікі, якія дапамагалі вучням падрыхтавацца да расказаў. На конкурсе прысутная была Іаанна Точка, візітатар Куратoры ў Беластоку, якая курыруе навучанне беларускай мовы.

Аляксей Мароз

Цудоўны абраз Гадышэва

Сёння каталіцкая парафія ў Гадышэве налічвае 550 душ з Гадышэва і найбліжэйшых вёсак: Юзкаў, Кеўлакоў, Сцёнаў і Водзькаў. Апрача санктуарыя, ва ўрочышчы Крыніца, 700 метраў за Гадышэвам, знаходзіцца драўляная капліца, пабудаваная з таго ж матэрыялу, што і апошняя уніяцкая царква, знесеная ў 1932 годзе.

* * *

Гаварылі, што калісь у Гадышэве бацюшка з жыдам змовіліся зрабіць цуда і ікону на ліпу чаплялі. Калі вярнуліся першыя бежанцы, то кругом царквы валяліся іконы і харугвы. Званы з царквы закапаны, мабыць, на могілках; каля 1980 года былі ахвотныя шукаць іх з дэтэктарам металаў, але ім не дазволілі. Калі ў царкве абсталявалі касцёл, праваслаўныя ўдзельнічалі ў набажэнствах, але пасіўна — да споведзі не прыступалі.

* * *

Прадзед мой прыехаў у Сеські аж з Люблінскага. Служыў ён у пана Чаркоўскага фурманам. У Сцёнах парцэлявалі зямлю Чаркоўскага і ён прапанаваў прадзеду пяцьдзесят гектараў найлепшай зямлі бясплатна, але прадзед адмовіў:

— А што я буду з гэтай зямлёй рабіць?

Прадзед быў доўгі час старастам у гадышэўскай царкве. Тады і каталікі хадзілі ў царкву, бо там касцёла не было. Калі ўспыхнула першая сусветная вайна, праваслаўныя хацелі схаваць царкоўныя званы, але ніхто не ведае, куды іх падзелі. Калі мае дзяды падаліся ў бежанства, то тата ішоў аж да самых Баранавіч пяшком, бо на возе не было месца для сядзення. У 1915-21 гадах былі ў Чачні. Калі вярнуліся, у Гадышэве быў ужо касцёл. Адзін чалавек папрасіў майго бацьку за кума, але ксёндз у Гадышэве не ведаў, ці праваслаўны можа падаваць каталіцкае дзіця да хрышчэння. Тады кумы паехалі ў касцёл у Пекуты, бо там быў знаёмы ксёндз, які такіх сумненняў не меў, і ахрысцілі.

Ксёндз на рэлігіі расказваў, што калі ў Гадышэве аб'явілася на ліпе ікона Багародзіцы, дык бацюшка стаў здзяйсняць цуды. Аднаго хворага, які выў і брыдкасловіў, трымала аж шасцярых мужчын, а пасля набажэнства злы дух выйшаў з яго, ён стаў нармальны і дзякаваў. Калі разбіралі гадышэўскую царкву, дык з яе вывезлі два жалезныя вазы кастылёў. Пасля праваслаўныя ў касцёл не хадзілі, толькі ў цэрквы ў Малешах або Браньску; у Гадышэва ездзілі толькі на Зялёныя Свёнткі. Дзеці, якія хадзілі ў школу, штодзённа заходзілі ў капліцу, якая заўсёды была адкрыта, і маліліся. Стаяла там скарбонка, у якую можна было класці ахвяраванні на аздараўленне.

* * *

Мой прадзед быў з Зубава. Купіў ён у Тапчэве зямлю, бо там пан не аплачваў падаткаў і за падаткі яму зямлю забралі і распрадалі. Было многа такіх, што раскупілі тую зямлю — уся вуліца Мазавецкая ў Тапчэве была заселена праваслаўнымі. Яны хадзілі ў Гадышэва на каталіцкія набажэнствы пакуль царква стаяла, а як знеслі, перасталі хадзіць. Калі прыйшлі саветы, многія праваслаўныя кінуліся ў іх органы. Пасля вайны амаль усе жыхары вуліцы Мазавецкай выехалі або ў СССР, або перасяліліся ў бок Бельска.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Абраз у капліцы на гадышэўскай Крыніцы

* * *

Яшчэ нядаўна жыў чалавек, які бачыў, куды закапалі гадышэўскія званы, крыжы і іншыя прадметы культу, але баяўся гэта выявіць, каб іх каталікі не забралі. Большасць праваслаўных у наваколлі выехала, частка перайшла на каталіцызм: Сцёны — выехалі, Сеські — выехалі, Ферма — перайшлі. У праваслаўных да першай сусветнай вайны Свірыдах жылі толькі тры каталіцкія сям'і, пасля другой сусветнай вайны з вёскі выехала ў СССР 24 сям'і, мешаныя сужонствы прымалі каталіцызм; цяпер у Свірыдах толькі трэць праваслаўных. Калісь цэлыя Залускія былі праваслаўныя, цяпер няма там ніводнай праваслаўнай душы.

* * *

Сённяшняе наваколле Гадышэва да трэцяга падзелу Польшчы (1795) ахоплівала лацінская Луцкая дыяцэзія. Праваслаўная мітраполія была ў Кіеве, а ў яе складзе была таксама Луцкая дыяцэзія. Менавіта да яе спакон веку належаў прыход у Гадышэве.

Першыя весткі пра Гадышэва адносяцца да пачатку XV стагоддзя. Драўляная царква была тут ужо ў 1562 годзе. Быў гэта, зразумела, праваслаўны храм. Гэтая тэрыторыя з 1596 да 1639 года падлягала пад уніяцкую Луцкую дыяцэзію, з 1639 года да пачатку XVIII стагоддзя пад праваслаўную і з пачатку XVIII ст. зноў пад уніяцкую. У 1839 годзе царскі ўрад перавёў усіх уніятаў у Расійскай Імперыі ў праваслаўе. Не закранула гэта Гадышэўскага прыхода, бо граніца паміж Расіяй і Польшчай пралягала тады паміж Гадышэвам і прылягаючымі да яго Кеўлакамі. У 1875 годзе была скасавана унія і ў Каралеўстве Польскім. У адміністрацыйным парадку гадышэўскія прыхаджане былі прылічаны ў лік праваслаўных. Супраціўленне гэтаму пачалося зразу пасля скасавання уніі. Павятовы начальнік сцвердзіў, што ў 1876 годзе за падбухторванне супрыхаджан прысуджана на ссылку ў Варонежскую губерню шасцярых жахароў Гадышэва: Якуба Дэмянчука, Тамаша Дэмянчука, Ануфрыя Тамчука, Паўла Дэмянчука, Яна Тамчука і Яна Лысюка. Трох першых памерла ў тамашняй губерні, апошнія вярнуліся да сем'яў. (Дзеля параўнання: на поўдні Падляшша, 17 студзеня 1874 года ў Дрэляве каля Міжрэчча-Падляшскага і тыдзень пазней у Пратуліне каля Янава-Падляшскага, за супраціўленне пераводу ў праваслаўе царскім войскам было забіта каля дваццаці уніятаў — А.В.). У 1877 годзе старшы наглядчык дакладваў, што жыхары Гадышэўскага прыхода не прызнаюць праваслаўных святаў, народжаных дзяцей не хрысцяць і самі хаваюць памерлых. У 1896 годзе на тэрыторыі Гадышэўскага прыхода пражывала 337 праваслаўных, 239 каталікоў і 39 жыдоў. Калі ў 1905 годзе выйшаў указ аб верацярпімасці, жыхары масава пакідалі праваслаўе, напр. 137 жыхароў самога Гадышэва назвалі сябе каталікамі. У 1910 годзе на тэрыторыі прыхода было: 443 праваслаўных, 740 каталікоў і 35 жыдоў.

Першае апісанне царквы ў Гадышэве паходзіць з 1727 года. Быў гэта драўляны храм, абабіты дошкамі і накрыты саломай. У 1775 годзе за складчыны суседніх і мясцовых прыхаджан пабудавалі новую царкву. Храм пакрылі гонтай, а пярэднюю частку бляхай. У 1878 годзе паклалі краевугольны камень пад новую царкву. Пабудавалі яе з цэглы аж за 19 тысяч рублёў; грошы даў урад. У 1917 годзе храм у Гадышэве перанялі колішнія уніяты, тады ўжо каталікі. У 1932 годзе побач мураванай царквы сталі ўзводзіць сённяшні касцёл. У верасні 1939 года на ім быў ужо дах, але галоўны купал яшчэ не быў накрыты. У часе баёў у 1944 годзе касцёл быў часткова знішчаны ад удараў пяцідзесяці гарматніх снарадаў. Аднак істотных пашкоджанняў і трэшчын не было. 22 мая 1949 года касцёл пасвяціў ломжынскі біскуп. Цэгла з разабранай царквы была скарыстана для пабудовы Дома паломніка*.

Аляксандр Вярбіцкі

* За кнігай кс. Вітальда Емялітага *Sanktuaria Maryjne w Diecezji Łomżyńskiej.*

Туга па генію

Помню як сёння дзень 5 сакавіка 1953 года: ён быў у нас шэры і нецікавы, а ў Маскве, як казалі, было тады вельмі сонечна. У той дзень мой бацька меў ставіць на новым месцы — на пляцы сваіх братоў Ванькі і Мішкі, якія ў 1945-46 гг. выехалі ў Савецкі Саюз — перавезеную з вузкага і мокрага панадворка хату. Раней бацька даведаўся, што пляц па ягоных братах дубіцкая партыйная кліка прыдзяліла суседу і восенню 1952 года паспешліва запісаўся ў калгас і стаў у пільным парадку пераносіцца на бацькаўшчыну. Калі бацька пачаў ставіць сваю хату на тых самых камянях, дзе да вайны стаяла вялікая і прыгожая хата маіх дзядоў, якая ў вайну згарэла, прыйшлі таварышы з гміны і забаранілі бацьку будавацца, кажучы, што гэта ўжо не ягоны пляц. Пасля бацьку сказалі, што дазволяць будавацца, калі ён запішацца ў калгас. І хаця бацька калгасаў ненавідзеў, мусіў запісацца і такім чынам сваё адваяваў.

У той дзень яшчэ ніхто ў нас не ведаў, што да Сталіна завітала смерць, аднак людзі ведалі, што ён цяжка хворы, бо хаця ў вёсцы толькі некалькі гаспадароў мелі радыёпрыёмнікі з навушнікамі, аднак весткі разыходзіліся маланкава. Помню, як у тыя дні прагрукатаў нейкі вялікі ваенны самалёт і людзі загаварылі, што гэта Сталіну лякарствы павезлі, каб ратаваць. І ўжо на другі дзень, а гэта была, бадай, пятніца, людзі даведаліся, што правадыр усіх народаў і вялікае свяціла не жыве. Некалькі чалавек, што ні дзіўна, якія пастаянна хадзілі ў царкву, нават плакалі па Сталіне, хаця апошнія чамусьці не сумавалі. Калі ў нашай дзіцячай кампаніі згаварыліся пра Сталіна, намнога старэйшы за мяне сябра Андрэй шчыра сказаў: „Памёр Максім — [хрэн] з ім". Недалёка праходзіў адзін малады гмінны актывіст і ён пагрозліва спытаў: „Co powiedziałeś? Czy chcesz kilka latek dostać?" Мой сябра злякаўся, аднак пасля ўсё развеялася.

Тады вечарам у солтыса адбыўся жалобны сход, на якім адзін мясцовы камуніст голасна плакаў, а да яго далучыўся з плачам і солтыс — яны, мабыць, так па сваіх бацьках не плакалі, а пасля — да самай сваёй смерці яны не сказалі дрэннага слова пра Сталіна. Аднак большасць людзей, падсмейваючыся, сталі ўцякаць з таго сходу.

А ў Маскве, як сёння даведваемся, калі памёр Сталін, дык усе масквічы плакалі, хаця, бадай, кожная сям'я пацярпела ад яго панавання. Калі труна з целам дыктатара яшчэ стаяла ў Калоннай зале, сотні тысяч людзей ціснуліся да яе і паўстала паніка, у выніку якой затапталі некалькі тысяч чалавек. І хаця Сталін памёр, ягоныя паслядоўнікі, у іх ліку і той, што „раскрыў" ягоныя злачынствы, надалей крочылі ягоным шляхам і тыя цэрквы, якіх ён не ўспеў разбурыць, яны давялі да канца.

Мікалай Панфілюк

Аб'явы

Dymka, producent, tel. (022) 785 22 53.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Марыя Манаховіч

Першы снег

Дзеткамі доўгачаканы
Упаў на зямлю першы снег.
Колькі радасці прынёс ён,
На ўсіх тварах шчыры смех.

Дзеці бегаюць, смяюцца,
У рукі снегу набіраюць.
Лепяць снегавыя шары,
Потым хто далей кідаюць.

Знайшлі іншае заняцце,
Лепяць снегавую бабу.
З малых шарыкаў, вялізны
Паўстаюць шары адразу.

Шары хутка паўстаўлялі
Ад найбольшага да меншых.
Дзеці радасна гулялі
І спрачаліся, хто быў першы.

Баба стала як жывая,
Мае вочы, вусны, нос...
Адзін хлопчык здагадаўся,
Капялюш ён ёй прынёс.

Упрыгожана такая
Стаіць баба снегавая.
Дзеці бегаюць, смяюцца,
Рабіць зноў нешта бяруцца.

У казачнай краіне

Прывітанне, дарагая „Зорка"! Мы вучні VI класа Пачатковай школы ў Орлі любім вучыцца беларускай мове. На ўрокі беларускай мовы ў нас ходзіць 16 асоб. Любім чытаць кніжкі і глядзець казкі.

На адным з апошніх урокаў мы чыталі беларускія народныя казкі. Наша настаўніца, Марыя Саевіч, падзяліла нас на групы. Кожная група выбрала казку, якую прачытала — „Як курачка пеўніка ратавала", „Хітры вол", „Кісель". З героямі гэтых казак мы пазнаёміліся даўней. Гэта цікавыя і мудрыя гісторыі, з якіх можам многаму навучыцца. Герояў казак і іх прыгоды мы размалявалі і так узнікла невялікая выстаўка казачнай краіны.

Пасылаем Табе, „Зорка", некаторыя нашы малюнкі. Можа і ў іншых школах ёсць аматары беларускіх казак і яны, так як і мы, любяць рысаваць. Мы з ахвотай пазнаёмімся з нашымі аднагодкамі, якія любяць беларускія кніжкі. Можа з Тваёй, „Зорка", дапамогай яны напішуць нам пра свае ўлюбёныя гісторыі.

Вучні VI класа ў Орлі

Ля вогнішча ў пушчы

Канікулы — самы прыемны час. Не толькі летнія, але і зімнія. Розніца ў тым, што летнія трываюць намнога даўжэй. Некаторыя ў час зімовага перапынку ўвесь час сядзяць у хаце, таму што проста не маюць што рабіць, куды пайсці. Дзякуючы спадарыням Ірэне Ігнатовіч і Галіне Іванюк, нашаму класу ў час канікулаў не забракла атракцыёнаў. Сарганізавалі яны шмат экскурсій і спатканняў у першым тыдні канікул. У гэты час мы наведалі Новае Беразова, Беласток, Ліпіны, а таксама цікавейшыя месцы ў Гайнаўцы.

Пабыўку ў Новым Беразове мы пачалі з наведання „Хаты Стэфана", з цікавасцю прыглядаліся страусам. Мы паглядзелі ўсё тое, што сабрана ў дзвюх хатах. Пасля распалілі вогнішча і пяклі каўбаскі. Паеўшы і нагрэўшыся мы пайшлі на плябанію калядаваць. Там матушка пачаставала нас гарбатай і ласункамі. На гэтым, аднак, сустрэча не закончылася. Усе разам пайшлі паглядзець дзве царквы, якія знаходзяцца ў вёсцы. Захопленыя прыгажосцю цэркваў мы вярнуліся ў Гайнаўку.

У чарговы дзень мы паехалі ў Беласток і там наведалі каток. Усе ахвотна, аж да стомы, каталіся на каньках. Хаця змучыліся, але былі вельмі задаволеныя.

У перадапошні дзень канікул выправіліся мы ў Белавежскую пушчу на вогнішча, непадалёк вёскі Ліпіны. Туды заехалі мы на санях. Каля вогнішча ўся моладзь гуляла ў розныя зімовыя гульні. Гэта быў найцікавейшы дзень маіх зімовых канікул.

Аня Грыгарук,
белгімназія ў Гайнаўцы

Мал. АГНЕШКІ ШАЙКОЎСКАЙ, ПАЎЛІНЫ ШЫРЭНОС, АДАМА ЛУКАШУКА І РЫТЫ ПАСЕЧНІК

Загадкі

Выходзілі дванаццаць малайцоў, выносілі пяцьдзесят два сокалы, выпускалі трыста шэсцьдзесят пяць лебедзяў.

(год)

* * *

У маці дваццаць дзетак. Усе дзеткі — адналенткі.

(жаданьне)

* * *

Ён прысмакаў з'еў нямала,
а калі харчоў не стала,
лапу смокчучы заснуў,
ледзьве не праспаў вясну.

(мядзведзь)

* * *

Сівое сукно лезе праз акно.

(кедкішуха з кудзяматамі)

(мяцель, мяцьні, дні)

Кадзіла сармацкае

(працяг; пачатак у папярэднім н-ры)

Але подзвіг — гэта не ўся вайна. І не заўсёды сапраўдны подзвіг бачны і ацэнены. Беларускім вайскам даводзілася цяжка. Адзін за адным палалі мястэчкі і замкі, гінулі князі і простыя ваяры. Канстанцін Гарэшка бачыў, як смяротна паранены герой падае ў бруд, шэпчучы імя радзімы, і назаўтра пра яго забываюцца. А багацей, які не ўмее трымаць у руцэ меч і не падыходзіць да месца бойкі бліжэй, чым на адлегласць стрэлу, услаўляецца за вялікага ваяра. Прагнасць і жорсткасць ворага здавалася невымернай, і некаторыя пачалі страчваць надзею на перамогу... І нават на тое, каб проста — выжыць. Юны Гарэшка не хаваўся за чужыя спіны падчас бойкі, ён нават некалькі разоў вылучыўся сваёй адвагаю — але, не атрымаўшы жаданых узнагарод, страціў смак да гульні са смерцю. Вайна выявілася цяжкой працай, калі трэба было не толькі ўмець хвацка махаць шабляй, але і цярпець змору, голад і сцюжу. А калі гарматы цэляць ледзь не ў галаву, якая розніца, чые рукі рыюць акопы — шляхецкія або мужыцкія.

І вось пасля асабліва жорсткай бойкі Канстанцін застаўся ляжаць па стаптанай чужымі коньмі зямлі. Не, ён не загінуў , толькі страціў прытомнасць з-за раны. А калі ачуняў і агледзеўся вакол, то пабачыў мёртвыя целы, крумкачоў і дым. Не відаць было за ўсім гэтым маршалкаўскай булавы і закаханай князёўны. Дурноцце...

І Канстанцін перавязаў сваю рану, на шчасце, лёгкую, і рушыў не шукаць свой полк, хоць удалечыні даносіўся гук страшэннай бойкі і крыкі аб дапамозе, а скіраваўся дадому, туды, дзе яго любілі, дзе ім заўсёды захапляліся і дзе ён быў самым лепшым.

(працяг будзе)

Людміла Рублеўская

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Храбалоўская дэкламатарка

Зіма ў паэзіі

Ужо чарговы раз у Пачатковай школе ў Храбалах арганізавалі дзень паэзіі. У гэты раз быў ён пра зіму. Мерапрыемства, якое адбылося 22 лютага г.г., так і называлася — „Зіма ў паэзіі".

Дэкламатары выступілі з творамі польскіх і беларускіх аўтараў. Неўзабаве конкурс пра вясну.

Храбалоўскія чытанні асаблівыя — тут, як і ў школе, спалучаюць дзве родныя мовы (у школе вучацца беларусы і палякі), а свята паэзіі — асаблівы ўрок талерантнасці. ***Зорка***

Зімовы каток

Выйшоў беленькі каток
Пагуляць пад масток.
Там у коцікаў — каток,
Шкляны, роўны, слізкі ток.

Мароз нашага катка
Не прагоніць, не, з катка.
У яго футра — пухкі ворс,
Цёпла ў лапкі, цёпла ў нос.

Звонка едзе без канькоў,
Рыскі ў лёдзе — з кіпцюркоў.
Усе вясёлыя каткі
Пакатацца — мастакі!

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Павел Асіпюк — другі справа, далей Хрыстафор Грынявіцкі

Паўлік і Кшысь

— Наш Кшысь першы і ў вершах, і ў спорце, — пахваліў пяцікласніка Андрэй Пляскавіч, уручаючы хлопчыку сваю ўзнагароду — „Słownik wyrazów obcych".

Гаворка тут пра Хрыстафора Грынявіцкага з Нарвы. Кшысь ад гадоў прымае ўдзел у конкурсе „Роднае слова". У гэты раз ён падрыхтаваў верш Васіля Віткі „Забалелі ў вавёркі зубкі". Дэкламацыя атрымалася паспяховай — ён заняў першае месца.

Першае месца камісія прысвоіла таксама Паўліку Асіпюку, які выступіў з народнай казкай „Хітры вол".

Хлопцы звярнулі на сябе ўвагу не толькі журы, Кшысь і Паўлік спадабаліся сяброўкам, якія жыва хвалілі іх за выступленне і элегантнасць! ***Зорка***

Вершы Віктара Шведа

Лекарскія парады

— Пане доктар, ад учора
Мой жывот страшэнна хворы.
— Дык прызнайся, што ты з'еў?
— Шмат няспелых яблык з дрэў.

— Прыпішу табе, сынок,
Нешта добрае на зрок,
Каб мог бачыць заўсягды,
Што прымаеш да яды.

Малпы выключылі свет

— Адкуль, скажы нам Міхасёк,
Мы маем электрычны ток?
— Здаецца мне, што не іначай,
Як з гэтай Афрыкі гарачай.

Бо калі ўчора так было,
Што цалкам згасла нам святло,
У хаце закрычаў мой дзед:
— Зноў малпы выключылі свет!

Польска-беларуская крыжаванка № 10

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 6: Букет, адрас, крок, жыла, кампазітар, мурза, вежа, марш, сон, гук, полька, ла, ара, кампакт-дыск. Буклет, сола, крок, вол, камень, муж, прага, джаз, рыза, клад, шалі, яры, сатрап, парашут.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Бася Хіліманюк**, **Паўліна Паскробка**, **Кася Тарасюк** і **Юстына Даняльчук** з Дубін, **Марк Дэмбоўскі**, **Якуб Сухадола** і **Юстына Скепка** з Нараўкі, **Караліна Янюк** з Масева, **Марта Бірыцкая** з Семяноўкі. Віншуем!

Развітанне з часткай нашай гісторыі

У Найробі — сталіцы далёкай Кеніі год назад, 2 сакавіка 2004 г., памёр нестар польскай арыстакратыі князь Яўстафій Севярын Сапега — прадстаўнік заслужанага для Падляшша і важнага ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага княжацкага роду Сапегаў. Прах нябожчыка 31 ліпеня 2004 г. быў пахаваны ў парафіяльным касцёле ў Боцьках.

Гісторыю Вялікага княства Літоўскага, не ўпамінаючы Сапегаў, расказаць нельга, бо ўвесь гэты род пакінуў у ёй добры след. Сапегі далі айчыне 38 сенатараў і ніводнага здрадніка ці інтрыгана. Сейм Рэчы Паспалітай ужо ў 1768 годзе прызнаў сапраўдным княжацкае званне гэтай сям'і. У гісторыі вядомыя дзве лініі гэтага роду: кодзенскія Сапегі і другая лінія — ружанская, званая яшчэ северскай. Абедзве лініі карысталіся гербам Ліс. Сапегам стагоддзямі спадарожнічалі тры страсці: любоў да Бога, любоў да Айчыны, любоў да сям'і. Магчыма, дзякуючы гэтаму так высока цэнім маральны ўзровень гэтага роду.

Боцькі звязаныя з Сапегамі прынамсі з пачатку XVI стагоддзя. У 1508 годзе гэтую мясцовасць атрымаў віцебскі ваявода Іван Сямёнавіч Сапега, а год пазней заснаваў ён тут мястэчка на магдэбургскім праве. Івана Сямёнавіча пасля смерці пахавалі ў боцькаўскай царкве. Пачаткова гэты род быў праваслаўнага веравызнання, але з часам яго прадстаўнікі, падвяргаючыся модзе на рэнесансныя рэлігійныя навінкі, сталі пратэстантамі. У перыяд ярай контррэфармацыі ў Польшчы, як большасць кальвінскай шляхты, Сапегі паступова пераходзяць на каталіцызм.

Адзін з продкаў нябожчыка — Юзаф Францішак Сапега быў заснавальнікам парафіяльнага касцёла ў Боцьках і ў ім навечна спачыў ягоны прах. Тады ў касцёле ўзнікла спецыяльная капліца, званая сапяжынскай. На пачатку XVIII стагоддзя Боцькі адышлі ад Сапегаў і сталі ўласнасцю Браніцкіх. Пасля 1831 г. Сапегам канфіскавалі родныя Ружаны, а таксама Дзярэчын і Зэльву. У міжваенны перыяд бацька нябожчыка Яўстафія ў рэйтынгу найбольшых землеўладальнікаў у Польшчы займаў толькі 143 месца. Маёнткі Спуша пад Скідалем, Ельня каля Ліды і іншыя разам налічвалі ледзь 7 700 гектараў.

Менавіта ў Спушы 14 жніўня 1916 года нарадзіўся князь Яўстафій Севярын. Ягонай маці была князёўна Тэрэза Любамірская, якая ў 1909 годзе выйшла замуж за Яўстафія Каетана Уладзіслава Сапегу (1881-1963). Апошні ў міжваенны перыяд быў першым польскім паслом у Вялікабрытаніі, а ва ўрадзе прэм'ера Грабскага — міністрам замежных спраў. У час пасляваенных блуканняў былы польскі міністр, каб пракарміць сям'ю, вымушаны быў займацца свінегадоўляй у Афрыцы.

Памерлы год таму князь Яўстафій Севярын у 1939 г. змагаўся ў атрадах кавалерыі, а пасля вераснёўскага паражэння — папаў у лагер для ваеннапалонных. Пасля вайны не было яму дзе вярнуцца і тады рашыўся выехаць у Афрыку.

У Кеніі трэба было пачынаць з нуля. Якое ж багацце мог прывезці з сабою чалавек, які амаль шэсць гадоў правёў за калючымі дратамі лагера? Таксама беднай была Антаніна Марыя з Сяменскіх, з якою князь толькі што ажаніўся. Аднак цяжкой фізічнай працы Сапегі не цураліся. Вядомая была іхняя прымаўка: „Толькі хамства саромеецца бяды". Быў тады князь жывёлаводам, потым гандляваў драўнінай і металаломам, шукаў каштоўныя камяні, займеў капальню рубінаў у Танзаніі і ўрэшце — аж да канца жыцця вёў фірму, якая займалася арганізацыяй паляванняў-сафары. Сярод афрыканскіх паляўнічых вядомая была яго машына „Вацусь" — „Ландровер", выпушчаны ў 1955 годзе. Але князь не быў бы сабою, калі б абмежаваўся толькі да здабывання хлеба. Пачаў ён пісаць. У выніку паўсталі, вядомыя таксама польскаму чытачу, кнігі: *Сафары*; *Так было — недэмакратычныя ўспаміны Яўстафія Сапегі*; *Сапяжынскі дом*; *Спіс маёмасцей, маёнткаў, двароў, фальваркаў і вёсак, якія калі-небудзь належалі Сапегам*. Прыгожыя і разумныя гэтыя кнігі, асабліва апошняе выданне спатрэбілася б не аднаму даследчыку мінулага Беласточчыны.

Фота МАРКА ЦЫБАРТА

У 1998 годзе ўпершыню, амаль пасля 60-гадовай адсутнасці, князь Яўстафій наведаў роднае старонне. Менавіта тады напісаў такія вось словы: „Калі, даязджаючы ў Беласток, бачу гэтыя сасоначкі — гэта мой край!" А сваім наследнікам жадаў: „Хай Бог дасць нашым дзецям тую ласку, каб маглі штосьці любіць так, як мы любілі наш край". У 2002 годзе наведаў ён Боцькі. Тады ў мясцовым касцёле ўстанавіў мармуровую пліту ў гонар усіх памерлых у выгнанні князёў Сапегаў, а тутэйшую сапяжынскую капліцу абраў на месца свайго будучага вечнага спачыну.

У дзень пахавання князя Яўстафія боцькаўскі касцёл шчыльна запоўніўся прыбылымі сваякамі Нябожчыка, прадстаўнікамі арыстакратыі і членамі сям'і, якія з'ехаліся з розных краін і кантынентаў. Былі таксама жыхары Боцькаў і журналісты СМІ. Рэлігійныя ўрачыстасці ўзначаліў драгічынскі біскуп Антоні Дыдыч, які ў пропаведзі ўспомніў свае колішнія праезды цераз былую сядзібу роду Сапегаў — Ружаны. Сказаў ён, што тамашні княжацкі палац быў аазісам добрага абычаю, культуры, далікатнасці, зычлівасці, адкрытасці на патрэбы бліжніх, крыніцай сямейнай, родавай, рэлігійнай і патрыятычнай традыцыі. Урна з прахам спачыла ў сямейнай капліцы. У апошнюю дарогу князя Яўстафія правялі ўдава, тры дочкі з сем'ямі, братавая і далейшыя суродзічы. Падчас урачыстасці я зарыентаваўся, што толькі я адзін маліўся тымі ж малітвамі, якія спадарожнічалі Ягоным праваслаўным продкам; спадзяюся, што гэта не было Яму нямілае...

Нельга было адсутнічаць на гэтым пахаванні. Гэта было не толькі развітанне з князем Яўстафіем, але — у Ягонай асобе — з кавалкам нашай гісторыі, часткай існуючага ўжо толькі ў людской памяці Вялікага княства Літоўскага — нашай колішняй Айчыны.

Марэк Цыбарт

Добра падрыхтаваліся

Да раённага этапу Прадметнага конкурсу беларускай мовы арганізаванага для гімназістаў, які 17 лютага адбыўся ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прыступілі 63 вучні з 11 школ Гайнаўскага ды Бельскага паветаў і Беластока. Гімназісты атрымалі тэст, якім правяраліся веды па беларускай літаратуры, граматыцы і выбраных пытаннях па гісторыі Беларусі. Вучням трэба было напісаць аб'яву і выкарыстаць веды аб мясцовых святах і традыцыях.

— Калі нехта вучыўся, тады конкурс не быў цяжкім, — кажа бельская белгімназістка, якая перабівае нараканні сваіх сяброўак. Вучні з Бельска прызнаюцца, што рыхтуючыся да конкурсу раўнамерна расклалі сілы на вучобу па беларускай літаратуры і граматыцы. Звярталі яны ўвагу на эміграцыйную літаратуру, з якой знаёміліся апошнім часам.

— Любім чытаць вершы Наталлі Арсенневай, творы Масея Сяднёва і Ларысы Геніюш. Яны нам падабаюцца, бо ў іх уздымаюцца жыццёвыя, сапраўдныя тэмы, — заяўляюць Юстына Вайшковіч, Наталля Дзмітрук і Анна Нікалаюк. Усе яны збіраюцца паступаць у бельскі белліцэй. Дзяўчаты выхоўваліся ў польскамоўным асяроддзі. З дыялектнай беларускай мовай сустракаюцца дома і ў бабуляў.

— Па-свойму я размаўляю з бацькамі і бабулямі ў Пашкоўшчыне і Махнатым, — кажа Паўліна Глінка.

Сёлета гімназісты рана пачалі вывучаць беларускую літаратуру і граматыку. Мабілізавалі іх вялікія прывілеі, якія належацца пераможцам конкурсу.

— Нам настаўніца сказала, што лаўрэаты напэўна будуць прыняты ў выбраную сярэднюю школу, — гаворыць адна з удзельніц конкурсу.

— Рыхтуючыся да конкурсу, мы пашыраем свае веды па беларускай мове. Я даведалася многа цікавага аб гісторыі Беларусі і беларускіх пісьменніках. Цяпер мне будзе лягчэй вучыцца на ўроках беларускай мовы, — заяўляе Аляксандра Лаўранюк. Яна і сяброўка вучацца ў другім класе і мусілі прысвоіць матэрыял па літаратуры і граматыцы для трэцяга класа гімназіі.

— Да конкурсу прыступалі таксама вучні першых класаў і яны мусілі дадаткова вучыцца найбольш, — дабаўляе Аляксандра.

— Рыхтуючыся да конкурсу, мы рабілі націск на знаёмства з сённяшнімі і гістарычнымі беларускімі сімваламі. У адным пытанні спатрэбіліся нашы веды на гэтую тэму. Мне падабаецца беларускі герб Пагоня. На занятках беларускай мовы мы любім чытаць вершы. Пытанні па беларускай паэзіі былі таксама ў тэсце, — кажа Юліта Сахарчук. Удзельнікі конкурсу падбіралі вышэйшыя і найвышэйшыя ступені для прыметнікаў. Гімназістам трэба было выказацца ведамі пра амонімы, сінонімы, шукаць у тэксце і апісваць дзеясловы і выконваць іншыя падрабязныя задачы па граматыцы. У пытаннях па літаратуры паявіліся вядомыя прозвішчы — Наталля Арсеннева, Ларыса Геніюш, Масей Сяднёў, Алесь Салавей і Казімір Сваяк.

— Мне найцяжэй было дапасаваць аўтараў да прэзентаваных твораў. Складанымі былі таксама пытанні па граматыцы. Перад конкурсам я найбольш паўтарала пра лічэбнік і задача з гэтай часцінай мовы была ў тэсце. Аднак я больш люблю літаратуру, а канкрэтна паэзію. На ўроках мы чытаем многа апавяданняў, — гаворыць Эмілія Місяюк з Курашава. Яна яшчэ вучаніца другога класа гімназіі, але ведае ўжо, што пазней будзе вучыцца ў гайнаўскім белліцэі.

— Конкурс беларускай мовы патрэбны, бо мабілізуе настаўнікаў і вучняў да дадатковай працы. Дзякуючы конкурсу можна выбраць найлепшых вучняў, — кажа настаўніца з Чыжоў Вера Флёрчук. — У нашай школе ёсць вялікае зацікаўленне вывучанем беларускай мовы. Усе нашы вучні ходзяць на заняткі беларускай мовы. Ёсць асобы, якія не вучацца гэтаму прадмету, але яны таксама сядзяць на занятках і слухаюць, чым займаюцца іх сябры.

Настаўнікі з камісіі, якую ўзначальвала Іаланта Грыгарук з гайнаўскай белгімназіі, неадкладна пасля конкурсу прыступілі да праверкі прац. Аказваецца, што ажно 20 гімназістаў набрала звыш 39 балаў на 49 магчымых. Яны будуць змагацца за званне лаўрэата на ваяводскіх элімінацыях. Найбольш балаў сабралі Марта Федарук з бельскай „тройкі", Аня Грыгарук з гайнаўскай белгімназіі, Паўліна Глінка з бельскай „тройкі", Ева Багроўская з Комплексу школ у Дубічах-Царкоўных і Аляксандра Лаўранюк з Бельска.

— Вучні былі добра падрыхтаваныя да конкурсу. Узровень работ выдатнай большасці гімназістаў быў высокі. Найлепш атрымаліся ў вучняў скланенні словазлучэнняў. Цікавымі былі аб'явы. Правільна гімназісты пісалі пра бежанства. Найцяжэй вучням было падбіраць загалоўкі і аўтараў да прэзентаваных твораў, — паведаміла старшыня конкурснай камісіі Іаланта Грыгарук. ***(ам-з)***

Легенда аб выпраўленні граніцы

Сярод шырокай прасторы поля, пашы і раскідзістых кустоў скрываецца Апака-Вялікая. Мяжуе з Беларуссю. Даўней вёску называлі Апака-Дварэц, бо тут знаходзіўся панскі маёнтак, які мясцовыя жыхары называлі „двaром". Маёмасць пазней раскупілі. Па „двары" след прастыў. Нават прозвішча пана не захавалася ў памяці сялян, адно назвы ўрочышчаў прыпанінаюць мінулы час. Вось што расказаў мне 74-гадовы **Уладзімір Ляшук**, ураджэнец Апакі-Вялікай.

— За вёскай, у напрамку Вярховічаў, шумела „Плошча" — даўнейшы панскі лес. Паміж нашым лесам, а „Плошчай", цягнуліся „Облогі", затым „Жырылец". Поле хоць і аблогамі называлі, але засявалася збожжам. Да Казімярова палеткі даходзілі. Пад Гайкамі былі пашы. Урочышча называлі „Огныска". З Пагулянкай межавалі „Мінювшчына" і „Олёс". Далей „Груд", „Бор" і „Прыдаткі". На гэтым апошнім урочышчы ў 1958 годзе жыхары збудавалі царкоўку. Да вайны Апака належала да прыхода ў Вярховічах. Пасля ўстанаўлення граніцы Апаку прыпісалі да Вэрстока. Там хавалі памерлых. Зараз могільнік знаходзіцца каля каплічкі.

У міжваенны перыяд у Апацы было больш за трыццаць дамоў. Найбольш вядомыя прозвішчы гэта Іванюкі, Саўчукі і Сідарукі. У нашага бацькі было дзевяць дзесяцін зямлі, што складала каля дзесяці гектараў. Пасля вайны палавіна гаспадаркі засталася за мяжой. Гаспадарка сярэдняй лічылася. У Іванюкоў (двух братоў) было каля шаснаццаці гектараў. Мелі шырокамалотку і манеж. Як камусьці малацілі, дык плату бралі ад вымалачанага снапа. У суседа Трафіма Іванюка быў ветраны млын. Пасля вайны разабралі.

У вёсцы дзейнічала чатырохкласная школа. Вучыліся дзеці з Асын, Марцінюкоў, Вокастаўца, Пагулянкі і Апакі-Малой. Пачаткова вучыў Гаўрыла з Асын. Яму за працу плацілі жытам. Пасля прыслалі настаўніцу з Кляшчэляў. У Лапінскіх яна кватаравалася. Пры камуне Жорж Панько настаўнічаў. Як ліквідавалі школу, дык апацкія дзеткі даязджалі ў Дабрываду і Палічну.

У час устанаўлення савецкай граніцы ў 1948 годзе мяжу павялі праз вёску

Праз нейкі час мяжу перанеслі пад лес, там дзе зараз яна знаходзіцца

У час устанаўлення савецкай граніцы ў 1948 годзе мяжу павялі праз вёску. Адзін бок заставаўся ў СССР, другі — у Польшчы. Людзі ў перапалоху ўцякалі на польскі бок. Прыехалі вайскоўцы і загадалі заставацца. Праз нейкі час мяжу перанеслі за вёску, пад лес, там дзе зараз яна знаходзіцца. Што паўплывала на перамену рашэння ды хто за тым стаяў — цяжка сказаць. У наваколлі па-рознаму каментуюць справу. Адны кажуць, што за бочку мёду, а іншыя, што за гарэлку перакупілі рускага камісара. Жыхары Апакі іншай думкі. Вось, што пачуў я ад **Васіля Іванюка**, які працаваў начальнікам на чыгунцы ў Чаромсе.

— Пасля фронту, у 1944 годзе, вёскі Казімярова, Марцінюкі, Сіпуркі, Вокаставец і Апака-Малая належалі да Польшчы. Тады паставілі адно слупы. Другі раз павялі мяжу праз вёску. Як людзі на рускім баку пачалі разбіраць хаты, дык прыехалі вайскоўцы і казалі на месцы заставацца. Растлумачылі, што справа канчаткова вырашыцца ў хуткім часе. Так было. Граніцу пусцілі 2 кіламетры далей і вышэйзгаданыя вёскі засталіся ў СССР, а Апака-Вялікая захавала даўнейшыя межы і апынулася ў Польшчы. Ніякіх хабараў апачукі не давалі. Справа лічылася дзяржаўнай вагі і рашалася на дыпламатычным узроўні. Такой думкі былі іншыя мае суразмоўцы. Легенда аб хабарах за карэктуру граніцы ў Апацы з'яўляецца адно буйнай фантазіяй паасобных расказчыкаў.

Уладзімір Сідарук

У вясковай санацыйнай школе

Дзяцінства маё прайшло ў вёсцы Аўгустова, у якой я нарадзілася. Яно, хаця ўжо і далёкае, але калі аб ім успамінаю, зноў становіцца мне вельмі блізкім. У ім і пачаўся мой цяжкі шлях у навуку.

Пачала я вучыцца ў 1932 годзе ў чатырохкласнай школе, якая знаходзілася ў нашай вёсцы, у цесным невялічкім гаспадарскім пакоі. У гэтай школе працавала адна старэйшая настаўніца, пані Ліпецкая. Яна была маёй першай настаўніцай і выхавацелькай. Добрая для ўсіх дзяцей, быццам другая маці.

Заняткі адбываліся ў дзве змены: спачатку трэці і чацвёрты класы, а потым — першы і другі. Навучанне адбывалася на польскай мове, і мы спачатку не ўсё разумелі, што да нас гаварыла настаўніца. Асабліва цяжка мне было вучыцца ў першым класе, і я была вельмі шчаслівая, калі была пераведзена ў другі клас. Потым пайшло крыху лепш, і я дайшла да трэцяга класа. Кончыўся навучальны год, ацэнкі атрымала я добрыя, але ў чацвёртым класе ніводнага з маіх аднагодкаў, а ў тым ліку, і мяне, не перавялі, таму што трэба было яшчэ год вучыцца ў трэцім класе, па нейкаму курсу „Б".

Ішлі гады і прыносілі змены ў маім школьным жыцці. Школа знаходзілася ў другім гаспадарскім доме, у такім жа цесным пакоі, у якім займаліся два класы на адной, і два класы на другой зменах. Вучні сядзелі па чатырох за адной партай, а некаторыя нават пры стале настаўніка. Настаўнікам нашым быў пан Станіслаў Дзёнска, перад якім усе дрыжэлі. Ён не толькі ставіў на калені, але схапіўшы лінейку або драўляны пенал, біў так, аж „лапы" пухлі.

Чацвёрты клас у вясковай школе таксама нельга было кончыць за адзін год. Вучням, якія не ішлі вучыцца ў горад, трэба было сядзець у чацвёртым класе тры гады, пакуль яны не будуць мець чатырнаццаць гадоў. У гарадскія школы з соцень траплялі адзінкі. З нашай вёскі толькі дзве асобы закончылі гімназію. Гэта быў Якаў Бусловіч і Надзея Вашкевіч. Бацькоў вельмі многа каштавала гэтая навука. Мусілі нават прадаваць, так цэнныя ў тыя часы, загоны поля. Вышэйзгаданыя працавалі настаўнікамі.

Мне прыйшлося праседзець у чацвёртым класе два гады, а на трэці пайшла я вучыцца ў горад. Там кончыла пяты і шосты класы. Пачалася вайна 1939 года. Ад 1939 па 1941 год я вучылася ў Бельску-Падляшскім у беларускай няпоўна-сярэдняй школе. Там усе прадметы былі на беларускай мове, а былі яшчэ нямецкая і руская мовы як прадметы.

Перад вайной умовы на вёсцы былі вельмі цяжкія. Дзеці летам хадзілі ў школу босыя, не мелі добрай вопраткі. У горад таксама хадзілі без абутку і толькі перад горадам абуваліся. Сялянскія дзеці насілі кніжкі ў сумках пашытых з самаробнага матэрыялу.

Нягледзячы на такія цяжкія ўмовы, вельмі хацелася вучыцца. Часта, рыхтуючы ўрокі, прыходзілася сядзець пры нафтавай лямпе, да позніх гадзін вечара. Здавалася, што ўсё гэта зусім нармальнае, бо мы не бачылі лепшага жыцця і таму не маглі сабе ўявіць, што могуць быць такія ўмовы, якія маюць цяпер дзеці і моладзь.

Марыя Манаховіч

Трывога на вецер

У „Газеце Вспулчэснай" ад 7 лютага г.г. была надрукавана трывожная вестка, што ў Беластоку каля блёкаў знойдзена нежывую 36-гадовую жанчыну родам з Дубіч-Царкоўных; імя і прозвішча не паведамлялася. У нашай вёсцы ад гэтага зашумела як у мурашніку: усе распытваліся, хто гэта самагубна загінуў, скачучы з высокага паверха. Але ніхто нічога талковага не ведаў, а смерці ж у мяшку не схаваеш. І было ясна, што ў газеце наконт дубіцкай нябожчыцы схлусілі, бо калі і здарылася там нейкая трагедыя, дык чаму яе прыпісалі да нашай вёскі? Пазней высветлілася, што ў Беластоку загінула жанчына з Вэрстока.

Лёгкадумны той аўтар „сенсацыі", бо ж растрывожыліся жыхары Дубіч, якіх дзеці пражываюць у Беластоку, ставячы сабе пытанні: „А ці яна не з нашай сям'і?" Пайшла ў свет хлусня, так як калісь пра неапазнаны лятучы аб'ект, які быццам меў прызямліцца ў Дубічах-Царкоўных. Тое НЛА пабачыў быў вечна запухлымі ад гарэлкі вачамі адзін п'яніца, а дзівакі паверылі, нават тэлебачанне прыязджала. Шчасце, што ў „Ніве" пра тое не пісалі і гэта нас ратуе. Хаця ведаем — калі не памыляюся — што часта напісаная ў газеце праўда не мае такога поспеху, як хлусня аб'яўленая нейкім дзіваком.

Мікалай Панфілюк

Набраўшы ў сваім камп'ютэры адрас „Славянскай аптэкі", карыстальнік апынецца ў цалкам беларускамоўнай аптэцы...

http://s-apteka.at.tut.by

Як гэта не прыкра, але час ад часу даводзіцца нам выклікаць да сябе лекараў, хадзіць да паліклініках і, зразумела, па лекі. „Медычнай" мовай можна без перабольшання назваць латынь — ёю мусяць валодаць усе, хто мае адпаведную медычную адукацыю. Але да наведвальнікаў лячэбных устаноў гэта не адносіцца. Звычайныя смяротнікі больш звяртаюцца там да ўсіх на мове свайго паўсядзённага існавання. Цяжка на Беласточчыне знайсці фармацэўта, які б прымяняў беларускую мову ў сваёй прафесійнай практыцы. Тое ж самае можна сказаць і аб іх калегах у Беларусі — нягледзячы на афіцыйна прызнанае двухмоўе, беларускай гаворкі ад людзей у белых халатах не пачуеш. Можа падацца, што няма месца беларускай мове ў паліклініках і аптэках. Але гэта будзе памылковая выснова.

Набраўшы ў сваім камп'ютэры адрас „Славянскай аптэкі", http://s-apteka.at.tut.by, карыстальнік апынецца ў цалкам беларускамоўнай аптэцы, хай невялікай па памерах, але вельмі незвычайнай. Такія эпітэты ў адрас камерцыйнай структуры, зразумела, успрымаюцца як непрыхаваная рэклама, але ў даным выпадку падаецца важным распавесці аб даволі рэдкай, на жаль, з'яве — выкарыстанні беларускай мовы ў фармакалогіі.

Першая старонка, якая адначасова з'яўляецца і галоўнай, зроблена даволі прывабна. Уверсе і ўнізе — сіні фон на ўсю шырыню выяўлення. У вочы адразу кідаецца назва сайта і фірменны знак аптэкі. З левага боку, як звычайна, выйсці да іншых рубрык і пошукавая сістэма. З правага — навіны ад кампаніі.

Звернемся да цэнтральнай часткі галоўнай старонкі. На ёй размешчаны фотаздымак чалавека, які ўсміхаецца. Звычайны для рэкламнай прывабнасці ход. Для нас найбольш цікавым ёсць тое, што пішуць беларускамоўныя аптэкары да наведвальнікаў іхняга сайта. Яны не паведамляюць ніякай інфармацыі, што выходзіла б за межы звычайнай рэкламнай аб'явы. Адзіная прыемнасць — усё зроблена па-беларуску і вельмі годна.

Калі звярнуцца да рубрыкі „Навіны", то ў ёй размешчаны паведамленні, якія былі найбольш вартымі ўвагі з пункту гледжання гэтай кампаніі.

Цяпер пройдземся па нешматлікіх іншых рубрыках сайта.

„Прадукцыя" распавядае пра розныя лекі, якія прапануе даная фірма пакупнікам у Беларусі. Увесь прайс-ліст складзены на беларускай мове і, шчыра кажучы, крыху дзіўна бачыць гэтую асаблівасць у сённяшні час яе занядбання. Старонка мае спакойны зялёны колер.

Вельмі цікавую інфармацыю можна атрымаць, зайшоўшы на старонку „Кантакты". На фіялетавым фоне падаюцца даныя аб самой кампаніі. Аказваецца, яна зусім і не беларуская, а расійская, і яе галоўны офіс размешчаны ў Маскве. Такая акалічнасць прымушае вельмі моцна задумацца над словамі аб нязручнасці ўжывання беларускай мовы ў якой заўгодна вытворчасці. Як паказвае практыка і даны сайт у прыватнасці, авалодаць беларускай мовай у стане нават тыя, хто з дзяцінства на ёй і не размаўляў. Больш таго, авалодаць дзеля сваёй прафесійнай дзейнасці.

Ну і самы цікавы момант усяго сайта — кароткі запіс які ледзьве чытаецца ў ніжнім левым вугле — „Беларускі варыянт вэб-старонкі выконваецца паводле класічнага правапісу". Вось так, пакуль у Беларусі думаюць, якім чынам пісаць словы, у Расіі ўжо вырашылі карыстацца „тарашкевіцай".

Уладзімір Лапцэвіч

На буйным турніры ў нямецкім Карлсруэ беларуска Наталля Сафронава стала мацнейшай у трайным скачку...

Беларусь, беларусы...

Лютаўскія ўзлёты

Люты быў даволі паспяховым месяцам для беларускіх спартоўцаў, якія парадавалі заўзятараў значнымі вынікамі на міжнароднай арэне. Прадстаўляем па 5 лепшых сярод мужчын і жанчын.

1. Аляксандр Сыман (біятлон). 27-гадовы ўраджэнец Капыля ўпершыню ў сваёй кар'еры дасягнуў значных індывідуальных поспехаў. Спярша ён заняў трэцяе месца ў гонцы на 10 км на этапе Кубка свету ў Італіі, а пасля бліскуча выйграў таксама спрынтэрскую дыстанцыю ў Славеніі.

2. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс). Беларускі маэстра малой ракеткі дайшоў да фіналу „ТОП 12", у якім браў удзел тузін мацнейшых тэнісістаў Еўропы. Па дарозе Уладзімір адолеў шэраг асаў, а ў фінале „падарыў" перамогу не самаму „зорнаму" майстру — расейцу Смірнову. Абураны нахабствам свайго апанента і памылкамі арбітраў, Самсонаў як сапраўдны джэнтльмен саступіў наўмысна. У цяперашнім спорце такія праявы сілы духа бываюць надзвычай рэдка.

3. Максім Мірны (тэніс). Трэці раз за кар'еру наша першая ракетка і рэкламны твар тэлефоннай кампаніі Velcom выйшаў у фінал турніру серыі АТП. У фінале спабору ў амерыканскім Мемфісе Мірны ўсё ж саступіў шведу Кенету Карлсену, але добрая форма Максіма перад матчам Кубка Дэвіса з румынамі абнадзейвае.

4. Аляксей Айдараў (біятлон). На першынстве Еўропы наш ветэран выйграў гонку на 10 км. Значнасць дасягнення нівелюе няўдзел у гэтых спаборніцтвах мацнейшых біятланістаў.

5. Аляксей Грышын (фрыстайл). Наш лыжны акрабат заняў трэцяе месца на этапе Кубка свету ў Японіі. Адзначым, што вышэй бронзы ў бягучым сезоне беларускія фрыстайлісты пакуль не ўздымаліся. А сапраўднай праверкай стане чэмпіянат свету, які пройдзе ў другой палове сакавіка.

1. Анжаліка Кацюга (канькі). Прыма нашага студзеньскага гіт-параду пацвердзіла свой высокі клас. У фінале Кубка свету, які прайшоў у нідэрландскім Херэнвене, Анжаліка заняла ў агульным заліку другое месца на дыстанцыях 500 і 1 000 м. Усяго ж цягам сезону ў калекцыі Кацюгі 11 медалёў (3 залатыя, 6 срэбных і 2 бронзавыя). Зайздросная стабільнасць!

2. Наталля Сафронава (лёгкая атлетыка). На буйным турніры ў нямецкім Карлсруэ беларуска стала мацнейшай у трайным скачку. Гэты вынік, акрамя прызавых грошай, забяспечыў Сафронавай пуцёўку на чэмпіянат кантынента.

3. Тацяна Шаракова (велатрэк). На апошнім этапе Кубка свету, які прайшоў у Аўстраліі, Тацяна заняла трэцяе месца ў індывідуальным пераследзе. Гэта не першы сур'ёзны поспех гоншчыцы на ровары з Оршы — год таму яна заваявала дзве срэбныя ўзнагароды чэмпіянату Старога свету.

4. Іна Капішына (плаванне). У чэмпіянаце краіны на „кароткай вадзе" гродзенка выйграла цэлы шэраг індывідуальных і эстафетных дысцыплін, прытым двойчы абнавіла рэкорды Беларусі на дыстанцыі 50 м брасам.

5. Алеся Турава (лёгкая атлетыка). На турніры ў Нямеччыне Турава вярнулася „з нябыту", узяўшы другі прыз у бегу на паўтары кіламетра.

Камандай месяца называем жаночую біятлонную дружыну, якая пасля недарэчнага першага этапу здолела выявіць волю да змагання і ўзняцца на трэцюю прыступку п'едэсталу ў эстафеце, што праходзіла ў Італіі.

Уладзімір Хільмановіч

Занатоўкі кантрабандыста

Лідскія авантурнікі

Спатрэбілася тры дні стаяння ў доўгай памежнай чарзе, каб лідскія хлопцы, Лявон, Сяржук і Мар'ян, зразумелі, што да запаветнага моманту перасячэння беларуска-польскай мяжы застаецца не менш тыдня.

— Так мы пяты не нагрэем, — заявіў у роспачы Лявон. — Тут мясцовыя кантрабандысты невядома што выробляюць. Лезуць без чаргі, як міністр у бардэль, а ты стой тут аж да сканчэння свету. Трэба і нам спрабаваць штосьці мяняць.

— Палезлі і мы нахабна, як усе нармальныя людзі, — прапаноўвае Мар'ян. — Чаго нам звяртаць увагу на гродзенцаў, калі яны нас не заўважаюць. Робім морду плугам, прыкідваемся кучай смецця і наперад.

— Ага глядзі, — не пагаджаецца Сяржук. — Дастанем па смаркачах і зноў станем у хвост чаргі. У гродзенскіх тут усё схоплена. Паўсюль знаёмыя. Ды іх тут значна больш чым нас. Мусім дзеіць не цвердалоба, і шукаць ражна на свой азадак, а перамагчы гэтых самаўпэўненых цецерукоў інтэлектам.

Лявон з Мар'янам перакінуліся здзіўленымі позіркамі. Яны недзе чулі слова „інтэлект", ды нават ведалі, як ім здавалася, што яно значыць. Але пачуць гэта з вуснаў Сяржука не чакалі. Ды яшчэ вось так, проста, нібы той апавядаў пра прычыны непазбежнасці эканамічнага крызісу еўрапейскіх краін з-за павышэння коштаў на акцыі нафтавых кампаній Амерыкі. Лявон нават напужаўся. У галаве мільганула думка, што ў Сержука хутчэй за ўсё праблемы з мазгамі — перамерз, хіба, на марозе.

— Можа не будзем нічога лішняга выдумляць, — прапаноўвае ён, — а проста падыдзем да міліцыянта, які кантралюе чаргу, і купім у яго талончык. І без праблемаў паедзем без чаргі. Многія так робяць. На гэтых талонах некаторыя зарабілі больш, чым жыд на золаце. Таму міліцыя з памежнікамі вечна варагуюць, якая служба павінна сачыць за парадкам і выдаваць талоны з нумарам у чарзе. Спекулююць тымі талонамі як хочуць. Прадаюць направа і налева. Бойкі за гэтую прывілею дапаўзлі ажно да міністэрскіх кабінетаў. Вядома ж, прадаўцы талонаў дзеляцца са сваім начальствам. А аднойчы, распавядалі неяк слонімскія хлопцы, міліцыянеры і памежнікі за права на валоданне тымі талонамі за зброю хапіліся. Амаль не перастралялі адзін другога.

— Вось! — радасна закрычаў Сяржук. — Вось што нам трэба. Купляем у міліцыянера талоны, ксерым іх, пераапранаемся ў міліцэйскія мундзіры і самі пачынаем тыя талоны прадаваць. Гэта тое, на чым і трэба зарабляць. І за мяжу ездзіць не трэба, дзерці свой пуп за пару смярдзючых златовак.

— Гэта авантура, — спалохаўся Мар'ян. — Зловяць і пасадзяць.

— Не смяшы мяне, і не нервуй, — „супакоіў" яго Сяржук. — Ніхто нас не зловіць. Галоўнае, як мундзіры апранём, быць цвярозымі як ксёндз у нядзелю. Папершае, іх талоны — звычайная папера з пячаткай. Зробім такую, што ніхто не адрозніць. А каб і злавілі нас, то што? Яны ж самі незаконна спекулююць тымі талонамі. Скандал ім непатрэбны. Адпусцяць нас і ўсё на гэтым.

На наступны дзень тры новыя „міліцыянеры" пачалі гандляваць „талонамі". Па дваццаць долараў за адзін. Людзі куплялі іх, і ехалі за мяжу без чаргі. Хлопцы толькі паспявалі складваць грошы. Ні сапраўдныя міліцыянеры, ні памежнікі не адрозніваліі іх падробленых талонаў ад арыгіналаў. Пакуль, на трэці дзень, нейкі кантрабандыст, купляючы квіток у сапраўднага міліцыянера, спытаўся, чаму ў таго талоны па трыццаць долараў, а ў міліцыянера на пачатку чаргі на дзесяць долараў таннейшыя.

Праз паўгадзіны кантрабандысты на памежным пераходзе Брузгі — Кузніца назіралі дзіўную з'яву. Каля пятнаццаці міліцыянераў з ашалелымі ад злосці і нянавісці тварамі „мясілі" трох сваіх калегаў. Білі іх нагамі, рукамі, палкамі і нават прыкладамі аўтаматаў. Шкода было тую тройку, але кантрабандысты не ўмешваліся. Палічылі, што міліцыя чагось не падзяліла між сабой. І хутчэй за ўсё прыбытку за „левыя" талоны.

Яшчэ праз гадзіну-тры збітыя ў горкі яблык хлопцы, у падзёртых міліцэйскіх мундзірах ехалі на машыне з Гродна ў Ліду.

— Казаў табе, што пападзёмся, — уздыхнуў адзін.

— І што? — адказаў іншы. — На нас усё зажывае як на сабаку. Затое зарабілі за гэтыя тры дні больш, чым за паўгода гандлярства.

— Што праўда, то праўда, — адгукнуўся трэці, прыкладваючы мокрую ганчучу да разбітага носа. — Трэба яшчэ штосьці такое прыдумаць. На такіх авантурах, я бачу, найлепшы прыбытак.

Сымон Нальшанскі

Мы шчаслівыя, што 49 гадоў разам

Самы бадай скептычны і адначасова самы рамантычны пісьменнік мінулага стагоддзя Эрых Марыя Рэмарк у адным са сваіх раманаў пачуццё кахання вызначыў так: „Кахаць кагосьці — гэта значыць хацець застарэць з ім разам”.

* * *

У першы дзень лістапада 1937 года ў сям’і Пятра і Лідзіі Салавеяў у вёсцы Рудня Беластоцкага павета нарадзілася худзенькая, з вялікімі блакітнымі вачыма і шыкоўнымі цёмнымі валасамі дзяўчынка, якой далі слаўнае імя Вольга. Бацькі Олі ўзрадаваліся такой прыгажуняй.

Оля расла, падрастала і калі ёй было 7 годзікаў, пайшла ў школу ў суседнюю вёску Рыбакі. Оля ўжо ў школьных гадах дапамагала бацькам на гаспадарцы. Хаця ў Салаўёў гаспадарка была невялікая, то работы хапала ўсім. Апрача земляробства Пятро Салавей займаўся пчалаводствам — ягоная пасека размешчана была ў садку за хатай. І вулеі, і дрэўцы ў садку былі ўтрыманы ў вялікім парадку, дагледжаны. Пры самым доме раслі высокія бярозы і ліпы. У свабодны ад навукі і працы час бацька хадзіў з Оляю на мост пасярэдзіне вёскі. З яго левага боку знаходзілася возера, а з правага — стаяў вадзяны млын на рэчцы Луплянцы. Прыгажосць краявіду напаўняла душу рамантызмам.

— Для мяне, — гаворыць Оля, — вельмі дарагія ўспаміны з дзяцінства, хай сабе і цяжкія. Было шмат перажытага і вытрыманага. Гэта засталося ў памяці назаўсёды.

У школе ў Рыбаках, на пляцоўцы, моладзь часта ладзіла танцавальныя вечарыны. На гэтыя забавы збіралася моладзь з навакольных вёсак, у тым ліку з Лукі. Прыходзіў сюды на танцы лучанін Аляксандр Анцутка. Лёс так распарадзіўся, што Саша заўважыў прыгажуню Олю. Пачалі яны сустракацца на танцах у Рыбаках і на мосце ў Рудні, там дзе калісьці на лодках плавала па

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Вольга і Аляксандр Анцуткі — вянчаліся, калі выходзіў першы нумар „Нівы”

возеры руднянская моладзь. Саша з Оляй сталі часцей спатыкацца, думаць ад супольнай будучыні.

У 1950 годзе Сашу прызвалі ў войска. Служыў ён 29 месяцаў. Стройны салдат часта прыязджаў у водпуск і не адной дзяўчыне марылася хаця б пагаварыць, ці патанцаваць з ім. Але Саша ведаў, што яго чакае Оля, што ім разам суджана шчаслівае будучае.

Пасля вяртання з войска Саша надалей наведваў Олю і аднойчы зрабіў нарачонай шлюбную прапанову, папрасіў таксама дазволу ў бацькоў. Шлюб у царкве ў Юшкавым Грудзе адбыўся 3 сакавіка 1956 года. Маладажоны сталі жыць у Луцэ ў хаце Сашыных бацькоў. Гаспадарка ў Луцэ таксама была невялікая, таму Саша зімою займаўся вырабам валёнак, зацікавіўся таксама пчалярствам, пераймаючы прытым вопыт свайго цесця Пятра Салаўя. Сваю пасеку Саша размясціў ва ўрочышчы Горы, у лесе каля вёскі Слабодка.

— Год 1987 аказаўся для нас трывожным, — гаворыць Аляксандр Анцутка. — Трэба было пакінуць сваю вёску Луку, усё нам дарагое і мілае, ды выбірацца адсюль, паколькі за нашай вёскай завяршалася пабудова Семяноўскага вадасховішча. Тады Лука, якая мела апынуцца на дне вадаёма, налічвала больш за сто дамоў і былі ў ёй школа, два магазіны, дзве кузні, святліца, свае краўцы, столяры, ганчары, рымар, муляр. А якія песні лучанская моладзь спявала вечарамі! Рэха нясло іх па рацэ Нарве ў навакольныя вёскі, напрыклад, у Рыбакі.

Вольга і Аляксандр Анцуткі, разам з іншымі жыхарамі вёскі, перасяліліся ў блёкі ў Бандарах, дзе жывуць да сённяшняга дня. Цяпер абое часта выходзяць на прагулку, каб падыхаць паветрам, якое нясецца ад затопленых вёсак Лука і Рудня, каб палюбавацца прыгажосцю краявіду — рэкамі Луплянкай і Нарвай, астаткамі той чароўнай прыроды, сярод якой жылі яны самі і іх продкі.

— Убок, направа ад былой вёскі Рудня, — успамінае Вольга Анцутка, — ад крыжа пралягала вясковая лясная сцежка, на якой ужо нікога не сустрэнеш. Вяла яна ва ўрочышчы „Вырэмбы”, „Гарабінка”, „Брод”, „Цісноўскі кут”, „Мікалаеў кут”, „Кіслюковае”, „Над борам” і іншыя, ад якіх у людской памяці засталіся толькі назвы. Сярод цяністых бяроз ад былой вёскі Рудня засталася памятка — крыж з прыгожым кавальскім карункавым упрыгожаннем.

— Успаміны пра зямлю, на якой чалавек нарадзіўся, — успамінае Аляксандр Анцутка, — застаюцца з ім на ўсё жыццё, дзе б ён потым не жыў.

— Можна шмат разоў мяняць месца жыхарства, — дадае Оля, — але малая радзіма застанецца радзімай, а перажытае, перанесенае застаецца назаўсёды.

Вольга Анцутка здаўна спявае ў царкоўным хоры ў Юшкавым Грудзе. У наш час, раздумвае Оля, цяжка абысціся без духовага апірышча, а царкоўныя песні з’яўляюцца тым сродкам, які прымушае людскія сэрцы быць цяплейшымі. Бузумоўна, калі гэта сапраўдныя людзі, калі яны падпадаюць пад гэтае вызначэнне. Свайго часу Оля, як і многія яе школьныя аднагодкі, прабавала сваіх здольнасцей у вершаскладанні. Захаваліся такія вось радкі:

З тваіх мне вуснаў асалоду піць...
Будзе многа яе, быццам мёду,
Нямала межаў у асалоды,
У бясконцай нам вечнасці жыць.

Аляксандр Анцутка звязаў свой лёс з жанчынай высокага душэўнага хараства, шчодрасці. У пачатку сакавіка будуць яны адзначаць юбілей 49-годдзя свайго шлюбу. У іх трое дзяцей. Сын Іван і дочкі Ірына і Анна — сямейныя і жывуць вельмі добра, па прынцыпах перададзеных бацькамі.

— Сорак дзевятая гадавіна сумеснага жыцця — гэта самая значная для нас падзея і самае вялікае шчасце, што мы калісь сустрэліся і што мы разам, — згодна сказалі Оля і Саша.

Усяго Вам найлепшага!

Віктар Бура

Ці павінна здарыцца?

Нядаўна, бо 27 студзеня г.г., свет адзначаў 60-ю гадавіну вызвалення Савецкай Арміяй гітлераўскага лагера смерці Аўшвіц-Біркенаў, што на тэрыторыі Польшчы. У знак пашаны загінуўшым ад фашысцкіх катаў (а загінула там каля паўтара мільёна нявінных людзей, пераважна яўрэяў), у той памятны дзень лідэры 44 краін нізка пакланіліся зямліцы і далі прысягу, што падобны сцэнарый генацыду больш не паўторыцца. А падобных лагераў смерці было больш і ў Польшчы, і ў іншых краінах захопленых фашыстамі. Найбольш іх, аднак, было ў Польшчы і таму прафашысцкія сілы ў Германіі называюць іх „польскімі”, хаця гэта няпраўда, бо яны фашысцка-нямецкія духам. А фашысты знайшлі ў Польшчы найлепшыя варункі для іх будовы таму, што тут пражывала найбольш яўрэяў. Калі Гітлер захапіў яшчэ заходнія тэрыторыі СССР, на якіх пражывала прыблізна паўтара мільёна яўрэяў, і яны амаль усе загінулі з рук нямецкіх катаў. А на іронію лёсу, перад гэтым Сталін падпісаў са сваім саюзнікам Гітлерам той ганебны пакт і ў „падарунак” фашыстам перадаў у іх рукі некалькі тысяч яўрэяў і нямецкіх камуністаў, якія ўспелі ўцячы ў СССР з тэрыторый, захопленых раней Гітлерам; амаль усе тыя людзі загінулі.

Мне, простаму чалавеку, здаецца, што біблейскае прароцтва абавязкова павінна збыцца — гэта наконт разумнага ізраільскага народа. Бо прыгадаем словы Евангелля і гісторыю распінання Хрыста, калі Пілат не змог Яго ўратаваць і абмыў рукі, бо дзікі натоўп крычаў: „Распні, распні!”, на сваю пагібель гаворачы: „Кроў Яго на нас і на дзяцей нашых” (Мф. 27:25). Гітлеру, аднак, не ўдалося знішчыць яўрэйскі народ, нягледзячы на ўчыненыя яму жудасныя пакуты, калі загінула каля шасці мільёнаў жыдоў. Народ уцалеў і сёння Ізраіль з’яўляецца моцнай, культурнай і багатай краінай, якой мы можам толькі пазайздросціць. І падумаць толькі: з беднай пустыні яўрэі стварылі прыгожы сад; а гэта таму, што яны — выбраны Богам народ, які ніколі не загіне. Нейкі малады яўрэй, гасцюючы ў нас, калі пабачыў балаган, запушчаную зямлю і прыгожую раку Буг, сказаў: „Калі б у нас былі такія ўмовы, мы зрабілі б рай на зямлі”.

Нядаўна прачытаў я кнігу Арно Люстыжэра п.з. „Czerwona księga, Stalin i Żydzi”, з якой даведаўся (хаця гэта не было мне тайнай), што Сталін і ягоныя супрацоўнікі былі нікчэмнымі антысемітамі. Вядома, Сталін ствараў іншыя, чым Гітлер, лагеры смерці, дзе знявольваліся людзі ўсіх нацый, у тым ліку і яўрэі, якія па-свойму думалі, верылі, марылі. І калі настала свабода, амаль усе яўрэі выехалі адтуль у Ізраіль і іншыя краіны Захаду. Але аўтар кнігі высока ацэньвае подзвіг савецкіх салдатаў, якія найбольш прычыніліся да вызвалення ўсіх народаў з рук фашыстаў. **(мп)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 914 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2005 r. upływa 5 marca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Залаты юбілей

Ужо хутка залаты
Юбілей нам адзначаць:
Поўных пяцьдзесят гадоў
Будзем „Ніву” мы чытаць.

Пажаданні шлю я ўсім,
Што „Ніву” стваралі,
Хто яшчэ ёсць у жывых —
Каб шчасце спазналі.

Наша мова беларуская
Нідзе каб не прапала,
Так дарагая яна мне,
У свеце каб развівалася.

Журналістам я жадаю,
Сто гадоў, каб пражылі,
Родную „Ніву” пашыралі,
У жыцці каб не зналі бяды.

Беларусам усім жадаю
Роднай мовы не забыць,
Сваёй мовай ганарыцца
Ды заўжды яе любіць.

Ганарыся роднай мовай,
Слоў яе не забывай,
Дзе хто ў свеце пасяліўся,
„Ніву” ты заўжды чытай.

Мікалай Лук'янюк

„Ніва” паднімайся

„Ніва” калыхайся,
Вышэй паднімайся,
Дай вялікі плён,
Шлю табе паклон
Ад душы і сэрца.
Чытачы, паверце:
„Ніва” — хлеб духоўны,
Корміць нас па-роўнаму.
Будзем яе трымацца,
Праўдаю займацца.
Каб нас не тапталі,
А ў свеце праслаўлялі,
Што маем паэтаў,
Якіх важнай мэтай:
Праслаўляць народ,
Беларускі род.
Праслаўляць прыроду
І даваць свабоду,
Ісці з Пагоняй мужна
І трымацца дружна —
Як адна сям'я
Дачакацца дня
Калі нас пабачаць
І прызнаць наважаць.
Маем і пісьменнікаў,
Сонечных пляменнікаў,
Ночку азараюць,
Усіх нас праслаўляюць.
Маем і вучоных
Знатных, не адмоўных —
Свет пра іх ужо знае,
Паважае, дбае.
Селянін не спіць,
Думае як жыць,
Працу вельмі любіць,
Шчыра прыгалубіць.
Мірны мы народ,
Беларускі род:
Нам вайна чужая,
Заўсёды ліхая.
„Ніва”, наша матка,
Сімвалам парадкаў.
Праз яе праходзім
І шчасце знаходзім.
Хай яна свяціцца,
А нам усім маліцца,
Што маем газету родную,
Цікавую, свабодную.

Мікалай Панфілюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сяброўская сустрэча пачынальнікаў і пазнейшай рэдакцыі „Нівы” (2003). Стаяць злева: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук, Галіна Рамашка, Ада Чачуга, Міхась Хмялеўскі, Юрый Валкавыцкі, Віталь Луба, Яніна Чэрнякевіч, Вера Валкавыцкая, Міра Лукша, Валянціна Жэшка, Вера Папова

Паважаныя чытачы „Нівы”! Садзейнічайце таму, каб „Ніва” была сапраўды беларускай, сапраўды цікавай, сапраўды дабразычлівай; каб спрыяла заўвядзенню лепшых беларускіх традыцый: кемпіваўі, рунілівасці, шчырай да людзей павагі.

22.02.2005 С. Шушкевіч

Юбілейныя прывітанні рэдакцыі і чытачам „Нівы” ад Станіслава Шушкевіча — першага старшыні Вярхоўнага Савета суверэннай Рэспублікі Беларусь

Беларускае аб'яднанне студэнтаў запрашае 10.03.2005 г. а 18⁰⁰ гадз. у кафэ „Фама” ў Беластоку на прэзентацыю фільмаў Юркі Каліны „Партызанская школа” і „Пагоня за праўдай”. Патранат над мерапрыемствам трымае наша газета.

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34						

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прымаўку.

1. джазавая музыка, якая адлюстроўвае лад і рытмы павольных лірычных песень амерыканскіх неграў = 3 _ 4 _ 5 _ 7 _;
2. індыйскі жрэц, брахман = 26 _ 14 _ 15 _ 12 _ 13 _ 24 _;
3. высокія шасты з прыступкамі для хадзьбы, не згінаючы ног = 18 _ 19 _ 21 _ 22 _;
4. гарадскі пасёлак між Лідай і Валожынам = 30 _ 28 _ 25 _;
5. вялікі калумбійскі горад = 1 _ 2 _ 33 _ 34 _;
6. сталіца Яраслава Мудрага = 20 _ 8 _ 10 _ 11 _;
7. егіпецкая рака = 9 _ 17 _ 16 _ ;
8. ісціна, што ў вочы коле = 29 _ 31 _ 32 _ 23 _ 6 _ 27 _; **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 4 нумара

Адзін, будзень, гаць, дзюдаіст, пуць, тын, Уса, харыст.

Рашэнне: **Студзень хаты студзіць, рана гаспадыню будзіць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

6.03 – 12.03

Баран (21.03. — 19.04.) У тваім знаку Меркурый — знак гандлю і бізнесу. Справішся ў ролі менеджэра, добра ўсё сарганізуеш, хопіць часу і на адпачынак. Каля 11.03. можа дарвацца да цябе хандра; не пачынай новых праектаў.

Бык (20.04. — 20.05.) Лёгка можаш знайсці занятак, які прынясе задавальненне. Прыемнасці дома. Запрашэнні ад сяброў. Форма кепскаватая, але не трагічная. Не сядзі, склаўшы рукі. Твой партнёр патрабуе спакою і бяспекі.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Да 7.03. можаш усё паафармляць. Твой партнёр акажацца быць цудоўным, толькі яму прыгледзься. Важнейшая ад вязаў крыві — роднасць душ. Ажыўленне ў фінансах.

Рак (22.06. — 22.07.) 11 — 15.03. калі нават прыйдзецца супернічаць, не дапусціш да адкрытага канфлікту. Прыдасца спакой, вопыт і памяркоўнасць. Перспектывы працы за мяжой; але не мяняй неразважліва занятку.

Леў (23.07. — 22.08.) Да 12.03. можаш брацца за рэалізацыю найцяжэйшых задач; поспех гарантаваны. Наробішся, але прэмія цябе не абміне. Асцерагайся залішняй самаўпэўненасці. Спакойна збірай вопыт у школе жыцця. Рэчы сапраўды каштоўныя не прыходзяць лёгка.

Дзева (23.08. — 22.09.) Пачуццё гумару, будзеш бачыць радаснае, вясёлае. 7— 11.03. клопаты ў тых Дзеў, якія не могуць стрымацца ад крытычных заўваг. Не мусіш зацiскаць пояс, хутчэй спадзявайся прыбытку.

Шалі (23.09. — 22.10.) Тваё сэрца заб'ецца хутчэй. Рашэнне аб змене працы можа быць асабліва карыснае. 10.03. (маладзік Месяца) вельмі спрыяе знайсці добрую працу. Не скідай зімовай шапкі!

Скарпіён (23.10. — 21.11.) 10.03. можаш пазнаёміцца з кімсьці асаблівым, сумленным, верным, уражлівым. З 11.03. пачні медытацыі, роздумы. Зайздрасць можа знішчыць пачуцці. Не пазычай грошай, удасца зарабіць.

Стралец (22.11. — 21.12.) Пры маладзіку Месяца (10.03.) можаш адчуваць вялікі неспакой, трывогу, але нічога табе не пагражае. Можаш сустрэць кагосьці, з кім хутка і моцна пасябруеш. Ашчаджвай грошы. Дапамажы сваячцы ў нейкай вельмі складанай праблеме, бядзе. Не апранайся залёгка.

Казярог (22.12. — 19.01.) 9 — 12.03. афармляй складаныя справы з шэфам, бацькам. Да 9.03. свае дзеці ці малыя сваякі залезуць табе пад скуру. Можа захапіць цябе хтосьці няварты захаду а нават увагі.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Крыху санлівасці. З 10.03. эмоцыі могуць узяць верх над розумам. Спадзявайся вялікіх грошай, але не выдавай іх заранёў. Могуць азвацца алергія ці іншыя хранічныя захворванні.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Кепская пара на флірты, знакамітая на глыбокія пачуцці. Не дайся ўблытацца ў несумленныя розыгрышы на працы. Не здраджвай фірменных таямніц. Вялікая сіла пераконвання, ініцыятыва, самастойнасць. Незалежна ад узросту — вялікія поспехі ў другога полу.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960